PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 32 (2465) Год XLVIII | Беласток, 10 жніўня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

„Ніва” перад пракурорам

Яўген Мірановіч

Такую інфармацыю можна было прачытаць у беластоцкай штодзённы „Кур'ер паранны” 30 ліпеня г.г. Рэдактар Збігнеў Нікітаровіч бліжэй неакрэсленым шляхам атрымаў рапарт, ці яго фрагменты, Найвышэйшай кантрольнай палаты (НІК), у якім вычытаў, што наша рэдакцыя незаконна выкарыстала 174 тысячы злотых датацыі з Міністэрства культуры на выданне тыднёвіка. Гэта каля 60 працэнтаў усіх грошай, якімі мы распараджаліся. Нікітаровіч працытаваў таксама шмат лічбаў, з якіх чытач мог зарыентавацца, што замест на друк грошы мы, між іншым, выдаткоўвалі на талоны на каўбасу, сыр і падобныя ласункі, ганарары плацілі сабе амаль такія як Нікітаровічу ў „Кур'еры паранным”. На канец паінфармаваў, што неафіцыйна даведаўся пра намер НІК аддаць справу „Нівы” пракурору.

Зараз пасля публікацыі ў „Кур'еры” пачалася ў польскіх сродках масавай інфармацыі антыніўская істэрыка. Беластоцкае тэлебачанне, праўда, пытала і мяне, як выглядаюць гэтыя фінансавыя справы, але працытавала толькі сенсацыі Нікітаровіча ды таксама аб'явіла: „«Ніве» капут”, суды, пракуроры, арышты. Беластоцкае тэлебачанне ўжо гатовае паказваць рэдактараў „Нівы” скаваных жалезнымі ланцугамі антытэрарыстычнай брыгадай.

Фінансаванне „Нівы” заўсёды было прадметам вялікай зацікаўленасці з боку ўсялякіх нашых таварышаў. Не было яшчэ, здаецца, ніводнага пленума Галоўнага праўлення БГКТ, каб дзеячы гэтай арганізацыі — зразумела цалкам спантанна — не вырашалі „справу «Нівы»”. Неафіцыйна ведаем, што таксама іншыя „выдатныя дзеячы” ахвотна бачылі б „Ніву” на старонках гісторыі, а датацыі, якія атрымлівае рэдакцыя, разлічваюць, трапяць на іх рахунак. Янка Купала амаль сто гадоў таму марыў: „людзьмі звацца”. У апошні час асаблівае зацікаўленне „Нівай” праявілі таксама дзяржаўныя службы. Чамусьці адзіная газета на беларускай мове стала раптам камусьці моцна перашкаджаць.

Кантроль НІК у „Ніве” пачаўся ў пачатку мая ды працягваўся паўтара месяца. Даслалі нам найлепшага спецыяліста па фінансавых справах. Ён шукаў-шукаў ды ставіў закіды. У гэты час я даведаўся, што міністр фінансаў і іншыя чыноўнікі выдалі з паўсотні распараджэнняў па бухгалтэрыі, пра якія я нічога не ведаў, не ведаю і ведаць не хачу. Прабаваў нават чытаць тыя дакументы, але найчасцей пасля першага абзаца патрэбны быў перакладчык з польскай на польскую мову. Першая высно-

[працяг ☞ 2]

Фота Мацея Халадоўскага

Машыніст Януш Высоцкі за пультам прыкладнога рэйкабуса

Рэйкавы аўтобус на выгуле

Больш за паўтары гадзіны ехаў сучасны рэйкавы аўтобус з Бельска-Падляшскага ў Беласток. І хоць можа ён перамяшчацца з хуткасцю 110 кіламетраў у гадзіну, гэты шлях ён адолеў з „хуткасцю” 30 км. Усё з віны старых шпалаў. Каб іх памяняць, няма грошай.

Польская дзяржаўная чыгунка ПКП разам з ваяводскім самаўрадам ды Згуртаваннем аматараў рэйкавага транспарту, арганізатарам акцыі „Szynobusy dla gmin”, арганізавалі прамацыйны праезд гэтага аўтобуса, галоўным чынам для журналістаў. Падобныя „выгулы” па амаль усёй Польшчы працягваліся два тыдні. У Бельску і Беластоку прадстаўнікі ПКП і вытворца (Познаньскае рамонтнае прадпрыемства рухомага чыгуначнага саставу) паказалі двухчленную мадэль. Ад наступнага года, мабыць на шляху Чаромха — Беласток, будзе ездзіць познаньскі адначленны аўтобус, абсталяваны, аднак, так як прэзентаваны.

— Гэта як камфартабельны, так і элегантны аўтобус. Каб больш такіх на нашых шляхах! — прызнаўся адзін з групы больш за дзесяці бяльшчан, якія прыйшлі паглядзець на гэтае цуда.

— Добра, што ў ім мяккія сядзенні, — заўважыў другі.

І фактычна, гонар вытворцы — якраз сядзенні: вандалаўстойлівыя! Адзін з прадстаўнікоў познаньскай фірмы паласнуў нажом па абліцоўцы. І нічога — ні адной рысы.

— Найгалоўнае, што аўтобус рухаецца плаўна. Пасажыры ў мінімальнай ступені адчуваюць, што едуць. Гэта і для машыніста адна прыемнасць, — гаварыў у размове з „Нівай” элегантна апрануты Януш Высоцкі, познаньскі машыніст, які кіраваў аўтобусам з Бельска ў Беласток.

У пульце ў кабіне машыніста няма вострых краёў. Абсталяваны ён у сістэму, якая дзякуючы маленькім камерам манітарує ўвесь аўтобус. Праз гучнагаварыцелі машыніст інфармуе пасажыраў аб чарговых станцыях, да якіх якраз даязджае, а назва станцыі высвечваецца на электроннай табліцы. У аўтобусе ёсць таксама туалет з унутраным зваротам вады. Што важнае, у аўтобусе нізкая падлога, дзякуючы чаму няпоўнаспраўныя будуць без праблем даставацца ў машыну. Хоць у прадстаўленай мадэлі не хапіла кандыцыянера, мае ён быць у „рабочых” версіях.

Прадстаўнік Згуртавання аматараў рэйкавага транспарту падкрэсліў іншыя ягоныя вартасці:

— Працуюць тут рухавікі ўнутранага згарання з малым расходам паліва, на дзве траціны менш чым у традыцыйных цягніках. Расходуе ён толькі 30 літраў аўтолу на 100 кіламетраў.

Як ужо мы пісалі, Падляшскі ваяводскі самаўрад падпісаў дамову на закупку аднаго рэйкавага аўтобуса. Каштуе ён больш за 2,5 млн. злотых. У год на больш няма грошай у ваяводскім бюджэце. І хоць валачэцца гэтая машына з Бельска ў Беласток вельмі доўга (аўто адольвае гэтую дарогу ў паўгадзіны), столькі, колькі традыцыйныя цягнікі, то ў адрозненне ад іх, „катаешся” ў ім камфартабельна. Што важна, пэўна яшчэ перад будучымі канікуламі на чыгуначным шляху Чаромха — Беласток зможам на ім ездзіць. І гэта шанц развязкі праблемы — планаванай, хоць да канца года спыненай, ліквідацыі каля дваццаці спалучэнняў на Падляшшы. Важна, каб ваяводскія ўлады знайшлі грошы набыць чарговыя рэйкавыя аўтобусы. (холм)

Песні над ракой Нараўкай ☞ 3

Вельмі добра зарэкамендаваў сябе ў Нараўцы маладзёжны мешаны калектыў „Лучына” (пад мастацкім кіраўніцтвам Гражыны Валкавыцкай) з Беластока. Мелі нагоду выступіць перад „сваёй” публікай „Нараўчанкі” (займаюцца пад кіраўніцтвам Пятра Скепкі).

Пераломная бітва ☞ 4

Бітву пад Курскам выйгралі аднак не савецкія танкісты, але артылерысты і пяхотныя войскі, якія знішчылі амаль палову нямецкіх танкаў. Нешматлікія ўспаміны ўдзельнікаў курскай бітвы так з савецкага, як і нямецкага боку паказваюць больш чалавечае вымярэнне гэтай падзеі. Нямецкае камандаванне апрача гарэлкі выдзяляла салдатам наркотыкі.

Тарасэвіч у цэнзарскім пейзажы ☞ 4

У апошні час у гэтым цэнзарскім пейзажы паказалася ў „Выбарчай газеце” інтэрв'ю з Лявонам Тарасэвічам. Прабуе ён тлумачыць польскую мастацка-палітычную рэальнасць. І наколькі ў шмат чым асабіста я з ім згодны, то некаторых спраў я не ўмею ўспрыняць іначай, чым правакацыю тыпу „Пасіі” Дароты Нязнальскай.

Кругі ў сусвеце ☞ 8

Барыс Руско, варшаўскі белавежац, інжынер вайсковай справы, дэбютаваў як паэт у 1992 годзе. Піша вершы ад больш чым дваццаці гадоў, але зборнікі пачалі друкавацца толькі ад 1998 г. Затое выйшла ўжо адзінаццатая ягоная кніжка — *Zawirowania*, у варшаўскім выдавецтве з цікавай назвай „Pani Twardowska”.

Родам з Беласточчыны ☞ 9

Дамінік Аніська нарадзіўся на Сакольшчыне, а з 1949 года жыў у Лондане ў Беларускім доме. Пражыў ён доўгае жыццё, але заўсёды заставаўся шчырым патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. Нават у вайсковай кніжцы (стану службы афіцэрскай) ён неяк запісаў: „Мова беларуская і народнасць беларуская, рэлігія рымска-каталіцкая”.

Сапраўдны кавалак раю ☞ 11

Пасля поўдня на пашы для тарпанаў адбыўся IV агратурыстычны чэмпіянат свету па кіданні абцугоў, які выклікаў вялікае зацікаўленне публікі. Кожны з трох катэгорый удзельнікаў — мужчын, жанчын і моладзі — тройчы кідаў кавальскія абцугі рознай велічыні.

Беларусь — беларусы

Праз два пакаленні ўсе загавораць па-беларуску

17 ліпеня ў Беларускім ПЭН-цэнтры адбыўся круглы стол, прысвечаны праблеме наяўнасці двух варыянтаў правапісу („наркамаўкі" ды „тарашкевіцы") і функцыянальнасці беларускай мовы.

Удзел у ім узялі доктар Ян Запруднік (Нью-Йорк), прафесар Генадзь Цыхун, галоўны рэдактар выдавецтва „Тэхналёгія" Зміцер Санько, рэдактар газеты „Салідарнасць" Аляксандр Старыкевіч, кандыдат філалагічных навук Юрась Бушлякоў, гісторык Алесь Белы, рэдактар часопіса „Arche" Валер Булгакаў і інш.

У існаванні двух варыянтаў правапісу, зазначыў Г. Цыхун, няма нічога страшнага: ёсць краіны, дзе суіснуюць некалькі літаратурных моў, не тое што варыянтаў. І дзяржаўнае ўмяшанне ці спроба гвалтоўнага вырашэння праблемы не дадуць тут плёну. Іншая рэч, што ўсё гэта вядзе да ўскладнення моўнай сітуацыі, у выніку чаго абывацель выбірае „просты варыянт" — пераходзіць на расійскую. Ю. Бушлякоў акцэнтаваў увагу на тым, што ў Беларусі ўсё ж існуе адна літаратурная мова і дзве правапісныя традыцыі. Выбар той ці іншай традыцыі не такі істотны, як уласна чысціня мовы.

А. Старыкевіч выказаў упэўненасць, што правапісны разнабой не перашкаджае беларусізацыі: „З тым самым поспехам можна сцвярджаць, што бел-чырвона-белы сцяг разбурае дзяржаву". А набыткі першай паловы 90-х можна хутка аднавіць пры змене дзяржаўнага курсу.

Поруч з двума варыянтамі правапісу, заўважыў Я. Запруднік, існуе разнабой і ў „тарашкевіцы". Неабходны звод правілаў, які уніфікаваў бы розныя прыватныя варыянты. Але пры гэтым не варта з непавагай ставіцца да носьбітаў „наркамаўкі": „Сёньня лепей мець чалавека, які піша „наркамаўкай", чым русіфікаванага".

В. Булгакаў наракаў, што ідэолагі абодвух варыянтаў правапісу не кантактуюць міжсобку: „Пазіцыі абсалютызуюцца абодвума бакамі: людзям здаецца, што яны валодаюць ісцінай у апошняй інстанцыі". На што запярэчыў Г. Цыхун, прывёўшы прыклады дыфузіі абодвух варыянтаў, лексічных, марфалагічных ды іншых новаўвядзенняў у „афіцыйны" варыянт мовы.

Насуперак цверджанням бальшыні А. Белы зазначыў, што нельга казаць адназначна пра маргіналізацыю беларускай мовы: „Па радыё цяпер значна болей, чым раней, чуваць песні па-беларуску. Гэты трэнд у процілеглы бок таксама існуе, і яго нельга не заўважаць". Я. Запруднік звярнуў увагу на тое, што цяпер падрастае новае пакаленне грамадзян Беларусі — людзей, якія выраслі ўжо ў новай дзяржаве: „Гэта пакаленне палітычна сведамых беларусаў, нават калі яны і расейскамоўныя. Але і расейскамоўны беларус будзе іншым праз два пакаленні".

Поўная стэнаграма „круглага стала" будзе выдрукаваная ў жнівеньскім нумары часопіса „Arche".

Аркадзь Шанскі

Кіраўніцтва Беларускага аб'яднання Аўстраліі з вялікім сумам паведамляе беларускае грамадства, што 1 ліпеня 2003 года адышоў у вечнасць грамадскі дзеяч, шматгадовы сябра кіраўнічых органаў Беларускага аб'яднання і дырэктар Беларускага клуба ў прадмесці Фэйрфілд — **МІХАСЬ ЦІХАН**.

Святой памяці **МІХАСЬ ЦІХАН** быў пахаваны на беларускай частцы Рыквуд могільніка і развітальны абед быў наладжаны ў Беларускім клубе ў Фэйрфілдзе.

Вечная і Заслужаная Яму Памяць!

Алесь Алехнік,
Генеральны сакратар
Беларускага аб'яднання Аўстраліі

Подых „гарачай" восені

Аб тым, што ў бліжэйшы час у Беларусі палітычных баталій не прадбачыцца, заявіў нядаўна па адным з расійскіх тэлеканалаў сам Аляксандр Лукашэнка. Аднак усе апошнія падзеі ў палітычным жыцці краіны ўказваюць на тое, што варта чакаць цалкам супрацьлеглага.

Нягледзячы на тое, што ў большасці дзяржаў свету другая палова лета ў палітыцы лічыцца „мёртвым сезонам", у Беларусі гэтая пара сёлета да краёў напоўнена разнастайнымі мерапрыемствамі палітычнага кшталту. І нядаўняя адстаўка ўрада, як аказалася, стала толькі адной з такіх падзей, прычыну якіх многія палітыкі бачаць у спробах далейшага працягнення паўнамоцтваў дзеючага прэзідэнта, апошняя кадэнцыя якога павінна скончыцца ў 2006 годзе.

На тое, што бліжэйшая восень будзе даволі бурнай указваюць меры па кансалідацыі як прапрэзідэнцкіх, так і апазіцыйных сіл. Самым цікавым у гэтым дачыненні ёсць адрозненне ў метадах кансалідацыі. Уладны бок спрабуе ўзмацніць сябе расстаўляючы на важныя дзяржаўныя пасады „праверaных", з пункту гледжання прэзідэнта, людзей, а таксама ўводзячы ў існуючыя дзяржаўныя ўстановы тых, каму трэба адсочваць сітуацыю і не дапускаць там высокага ўзроўню іншадумства. Тут трэба ўзгадаць нядаўняе змяшчэнне з пасады старшыні верхняй палаты беларускага парламента Аляксандра Вайтовіча, які дазваляў сабе на адрозныя ад прэзідэнцкіх меркаванні, і замены яго на былога прэм'ер-міністра Генадзя Навіцкага. І гэта не адзіны факт умацавання прэзідэнцкага кантролю над парламентам, які і без таго называюць „кішэнным", маючы на ўвазе падпарадкаванасць прэзідэнцкай адміністрацыі. Літаральна за некалькі дзён да згаданай падзеі А. Лукашэнка запрасіў да сябе сем парламентарыяў і прапанаваў ім быць, вобразна кажучы, сваімі вушамі і вачыма ў Палаце Прадстаўнікоў. І гэтыя людзі мусяць не проста адсочваць паводзіны іншых парламентарыяў, а таксама, „дапамагаць разабрацца прэзідэнту ў кожным дэпутаце". Зразумела, функцыі прадстаўніка прэзідэнта ў парламенце існуюць і ў іншых краінах, але гэтыя людзі не з'яўляюцца дэпутатамі і тым больш іх не сямёра, ды яшчэ разам са старшынёй ніжняй палаты. Па ўсім відаць, прэзідэнцкі бок усур'ёз заняўся моцнай ператусоўкай сваіх бліжэйшых паплечнікаў. Бо як сведчыць гісторыя, адзінаўладдзе не спрыяе ўзмацненню духу даверу ва ўласным атачэнні. Але ад прывіду змовы такія ператусоўкі выратоўваюць хіба толькі на кароткі час.

Спрабуюць гуртаваць сілы і апазіцыянеры. Як новыя, так і старыя. Так на сённяшні дзень ужо пяць буйных (па беларускіх мерках, зразумела) палітычных партый аб'ядналіся з мэтай супрацьдзеяння магчымаму правядзенню рэферэндуму, які б дазволіў А. Лукашэнку насуперак сёння дзеючай Канстытуцыі балатавацца на трэцюю кадэнцыю. Зважаючы на тое, што дадзенае аб'яднанне ставіць перад сабой канкрэтную мэту, а не абстрактную агульнадэмакратычную, прыходзіш да высновы, што намаганні хутчэй за ўсё не будуць страчаны дарэмна.

Дэпутацкая група „Рэспубліка", якая зарэкамендавала сябе як дэмакратычная фракцыя ў парламенце, таксама спрабуе генераваць цэнтраімклівыя тэндэнцыі. Стварыўшы рух „За годнае жыццё", гэтыя дэпутаты пашыраюць свой уплыў далей. Літаральна перад былым Днём Незалежнасці 27 ліпеня было дасягнута рашэнне аб пагадненні аб супрацоўніцтве паміж імі і Асамблеяй дэпутатаў мясцовых саветаў, куды ўваходзяць дэмакратычна арыентаваныя народныя абраннікі, якія ў большасці з'яўляюцца сябрамі апазіцыйных партый.

З усяго вышэйсказанага выцякае, што сёлетняя восень у беларускім палітычным жыцці будзе „гарачай". Цяжка пакуль адназначна сказаць ці пойдзе А. Лукашэнка на рэферэндум, ведаючы, што скасаванне палажэння аб двух тэрмінах прэзідэнцтва адной асобы не надта папулярнае ў беларускім грамадстве. Але працягнуць сваё палітычнае жыццё як мага больш цяперашняму кіраўніку беларускай дзяржавы патрэбна як паветра. Таму бурлівых палітычных падзей не абмінуць.

Уладзімір Лапцэвіч

„Ніва" перад пракурорам

[1 ☞ працяг]

ва — мы, як фірма, павінны мець юрыста на штаце, які сачыў бы за кожным новым распараджэннем кожнага новага міністра.

Другі, яшчэ больш патрэбны, штат — галоўны бухгалтар, які павінен мець актуальныя атэстаты. У нашай бухгалтар, якая выконвае нам паслугі, такіх атэстатаў няма, за што працадаўцу, гэта значыць мне, як старшыні Праграмнай рады, пагражаюць сур'ёзныя паслядоўнасці. Пры чатырох журналісцкіх штатах, гэтыя два, аказваецца, найбольш цяпер патрэбныя рэдакцыі.

Кантралёр НІК праверыўшы ўсе дамовы, якія мы падпісалі, і выдаткаваныя намі грошы з датацыяў прыйшоў да высноваў, што выдаючы „Ніву" мы парушаем большасць запісаў фінансавага заканадаўства краіны. Бухгалтарскія кнігі ляжаць у неадпаведным месцы, рэгістр рахункаў адбываецца са спазненнем ды заносяцца яны ў неадпаведныя месцы разліковай кніжкі. Усіх памылак хапае, каб атрымаць гадоў 10 турмы абвостранага рэжыму. Але гэта нішто ў параўнанні з нявыкарыстанай сумай, якую згодна падпісанай дамове, мы да 30 кастрычніка павінны вярнуць Міністэрству культуры. Датацыю на ўвесь год атрымліваем у сакавіку, красавіку, або і ў маі. У кастрычніку трэба пісаць справаздачу з выдаткаваных грошай. Ад лістапада да красавіка наступнага года часопіс трэба выдаваць за свае, якіх няма. Успомненыя 174 тысячы на працягу двух гадоў, якія кантраляваліся, мы, аказваецца, незаконна выдаткавалі на выданне „Нівы" ў гэты перыяд. Так было, дарэчы, ад доўгіх гадоў. Наш спонсар праўдападобна ведаў пра ўсю складанасць гэта працэсу, але калі „Ніва" пастаянна выходзіла, лічылася, што сродкі выкарыстоўваюцца мэтанакіравана.

Нікітаровіч вычытаў у рапарце, што дамагаліся мы звыш мільёна злотых на „Ніву", а атрымалі 700 тысяч. Не дачытаўся аднак, што гаворка ішла пра суму на тры гады і што звярталіся мы апрача „Нівы" на дафінансаванне яшчэ 14 іншых праектаў. Атрымалі мы 699 тысяч і ажыццявілі 10 праектаў, у іх ліку 4 кніжкі, 2 лагеры пад назвай „Варштаты «Зоркі»" і 2 літаратурныя конкурсы. На некалькі праектаў датацыі мы не атрымалі, але гэта не перашкодзіла Нікітаровічу трубіць пра завышаныя кошты, у якіх змяшчаліся сумы, за якія мы выступалі, але ніколі іх не атрымалі.

У сярэдзіне летняга сезону тэма пад загалоўкам „Канец «Ніве»" загасцявала ў беластоцкіх сродках масавай інфармацыі. Некаторыя журналісты хацелі даведацца, якім службовым аўтамабілем распараджаецца рэдакцыя, за якую суму адладзілі кабінет галоўнага рэдактара, ці за талоны куплялі мабільныя тэлефоны. Гэта праўда, што Віталь Луба сядзіць за антычным сталом — бо з эпохі ранняга Гамулкі, але гэтым сталом абдорыла яшчэ рэдактара Георгія Валкавыцкага Польская аб'яднаная рабочая партыя. Толькі цвікі, якімі мы пакарысталіся дзеля адладкі ўсёй канструкцыі, ужо з эпохі III Рэчы Паспалітай.

Згодна закону кожнае парушэнне дамовы дае Міністэрству культуры падставу адмовіцца ад датацыі. Калі нават дадуць нам датацыю, дык не можам абяцаць, што выдаючы „Ніву" будзем прытрымлівацца літары закону. Адно і другое адначасова немагчымае.

Разумеем радасць мясцовых палякаў ад інфармацыі, што нейкая „руская газетка" можа перастаць існаваць. Здзіўляемся аднак праявам задаволенасці некаторых „нашых" таварышаў, дзейнасць якіх адбываецца таксама за датацыі Міністэрства культуры. Адгадайце, каго пракантралююць наступнага.

Яўген Міранові ч

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

„Нараўчанкі"

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Ансамбль „Бераставіцкія музыкі"

Песні над ракой Нараўкай

Ідзе лета, а з ім народныя фэсты, якія ладзяць Беларускае грамадска-культурнае таварыства і ўлады паасобных гмін на Беласточчыне. Пабываў я на адным з іх у нядзелю, 27 ліпеня ў Нараўцы.

У нараўчанскім амфітэатры шматлюдную публіку прывіталі войт гміны Мікалай Павільч і старшыня Павятовага праўлення БГКТ у Гайнаўцы Яўген Валкавыцкі. Віталі яны таксама намесніка старасты Юрыя Сірака. Канцэрт вяла Кацярына Бяляўская з Гміннага асяродка культуры.

Першы на сцэну выйшаў народны ансамбль „Бераставіцкія музыкі" з Беларусі (працуе ён пад мастацкім кіраўніцтвам Марыі Юшкевіч). І паплылі лірычныя беларускія песні „Ой, там у лузе", „Цёплы ліпень", „Ой, я малада" і „Сеяла пятрушку", жартоўная песня „Музыка" ды беларускія народныя песні „Ой, развівайся да сухі дубе", „Устала дзеўка раненька" і „Шыпшына". Бераставіцкія народныя артысты прыгожа спявалі (тут і жаночыя, і мужчынскія цудоўныя галасы) і, не дзіва, іх мелодыі ўсім прыпалі да сэрца. Закончылі яны сваё выступленне песнямі „Едуць гарадскія" і „Чарка на пасашок".

Затым выступалі стараляўкоўскія „Цаглінкі" (мастацкі кіраўнік Мікалай Мяжэнны). Спявалі песні „Цякла рэчка пад масточкам" (дарэчы, амфітэатр у Нараўцы побач моста цераз рэчку), „А ў гародзе ярыца" і „Не капайце крынічэнькі". Выступленне іх было ўдалае.

Вельмі добра зарэкамендаваў сябе ў Нараўцы маладзёжны мешаны калектыў „Лучына" (пад мастацкім кіраўніцтвам Гражыны Валкавыцкай) з Беластока. Выконваў ён песні, між іншым, „Ехаў Ясь на кані", „Ой, на гары два дубкі", „Вяне рута на прысадах", „Ой, на горы дождж ідзе", „Ой, у полі азярэчка" ды „Ой, там каля рэчкі".

Мелі нагоду выступіць перад сваёй публікай „Нараўчанкі" (займаюцца пад кіраўніцтвам Пятра Скепкі). Праспявалі яны пяць песень.

Пасля бавіў гледачоў эстрадны гурт „Лідэр" з Беластока. Спявалі яны жартоўныя песні „Пчолы", „Вёсачка", „Ой, ты мой міленькі" і „Грай мая гітара".

Завіталі ў Нараўку, да цудоўнай, як сказалі, публікі гарадоцкія „Прымакі". Яны і закончылі трохгадзінны канцэрт сярод гарачага лета. Сваім бравурным выкананнем звонкіх песень не дазволілі нікому раней выйсці з амфітэатра, а стаяла ж у той дзень звыш 30-градусная спякота. Лягчэй дыхалася толькі тады, калі час ад часу павяваў лёгенькі, свежанькі вецярок. А дзеці, дык тыя з вады не выходзілі (рэчка побач) і яшчэ пасля канцэрта ісці дадому не хацелі.

Янка Целушэцкі

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Гурт „Лідэр" з Беластока

Цікавінкі „падляшскага" перапісу

У Падляшскім ваяводстве ў маі мінулага года, паводле праведзенага тады перапісу насельніцтва, пражывала 471,4 тысячы мужчын і 503,6 тысячы жанчын. З ліку мужчын кавалерамі было 33% гараджан і 36,2% сялян, а з ліку жанчын дзеўкамі было 26,3% гараджанак і 20,5% сялянак. Удаўцы складалі 3,6% сялян і 2,3% гараджан, а ўдовы — 19,7% сялянак і 12,9% гараджанак. Апошняя з'ява, гэта вынік ранейшага ўмірання мужчын чым жанчын.

Калі глянуць на месцы калектыўнага закватаравання, дык там наглядаецца наступная з'ява: у студэнцкіх дамах, рабочых гатэлях, псіхушках і асяродках наркатычнай дэтаксізацыі пражывае больш мужчын, а ў манастырах і манаскіх дамах ды ў цэнтрах грамадзянскай дапамогі састарэлым — больш жанчын. 76% жыхароў прытулкаў для бяздомных, гэта мужчыны.

За чатырнаццаць гадоў (ад перапісу ў 1988 годзе) адсотак людзей са звышпадставовай адукацыяй вырас з 46% да 61%. Жанчыны часцей (10,6%) чым мужчыны (8,3%) здабывалі вышэйшую адукацыю, звышліцэйскую (адпаведна 5,3% і 1,7%) і сярэднюю агульную (11,5% і 5,5%), затое прафесіянальную адукацыю мела 13,3% жанчын і 24,9% мужчын.

З пункту гледжання рынку працы насельніцтва ва ўзросце за 15 гадоў было падзелена на тры катэгорыі: працуючых, беспрацоўных і бяздзейных: першыя дзве катэгорыі абагульнена ў катэгорыю дзейных. Хаця на працягу разгляданых 14 гадоў лік насельніцтва ваяводства пабольшаў на 95,4 тысячы, колькасць дзейных людзей паменшала з 598,7 тыс. да 517,5 тысячы. Затое лік бяздзейных вырас з 280,9 тыс. да 402,2 тысячы. Адсотак дзейных асоб паменшаў з 68,1% у 1988 годзе да 56,3% у мінулым годзе. Старэйшыя асобы, якія сходзілі з рынку працы, мелі наогул ніжэйшую адукацыю ад маладых, якія папаўнялі фонды працы і якія да таго карысталіся разбудаванамі формамі навучання.

У гарадах жывецца лепш чым на вёсцы. У добрых і вельмі добрых умовах жыло 40,5% гараджан і 25,3% сялян, затое ў дрэнных і вельмі дрэнных — 25,3% гараджан і 48,7% сялян.

Плошча пасеваў у нашым ваяводстве паменшала на 12,8%, у іх ліку збожжавых культур на 6,2%, а бульбы на 42,7%. Пабольшала пагалоўе кароў (на 12%) і дамашняга птаства (на 24,7%), але паменшала свіней (на 2,8%), коней (на 39,6%) і авечак (на 42,6%). Апошнюю з'яву спарадзіў малы попыт на бараніну і цяжкасці з продажу воўны.

У Бельскім, Гайнаўскім і Сакольскім паветах гадуецца найбольш авечак (адпаведна 19,1%, 16,7% і 24,3% усіх у ваяводстве), калі ў той час усе паветы былога Ломжынскага ваяводства гадуюць іх усяго 10,1%. Апошні абшар, Ломжынскі падрэгіён (Усходняя Мазовія) у сельскагаспадарчых статыстыках раздзелены ад Беластоцка-Сувальскага падрэгіёна (Усходняя сцяна). У Ломжынскім падрэгіёне 67,2% усіх бульбаўборачных камбайнаў ваяводства (у адным Высокамазавецкім павеце /29,3%/ — іх амаль столькі, што на цэлай Усходняй сцяне /32,8%/), 90,1% буракаўборачных (у Ломжынскім павеце 64,5% і Высокамазавецкім 23,3%) і 41,2% збожжаўборачных (13,7% у Высокамазавецкім; дзеля параўнання — у Гайнаўскім павеце апошніх 2,7% — найменш у ваяводстве). І яшчэ адно супастаўленне Высокамазавецкага і Гайнаўскага паветаў: у першым гадуецца найбольш малочных кароў (53 837), а ў апошнім — найменш (9 678).

Калі глянуць на колькасць асоб у дамашніх гаспадарках, то наглядаецца вельмі характэрная з'ява абмежаваная толькі да „нашых" паветаў: рэзкая перавага адна- і двухасабовых гаспадарак над людзьмі нейшымі. У хатах вёсак ад Сакольскага да Сямятыцкага паветаў пааставаліся, відаць, найчасцей адно бацька з мацераю або толькі адно з іх. Пацвярджэнне гэтаму ў іншай статыстыцы: на адно памяшканне выпадае 0,73 асобы ў Гайнаўскім павеце ці 0,76 у Бельскім, калі ў Граеўскім 0,96 ці Ломжынскім 0,97.

Можна глянуць і на некаторыя гмінныя статыстыкі. У Бельскім павеце сярэдняя плошча вясковых хат у Арлянскай і Бельскай гмінах на дзесяць квадратных метраў меншая чым у заходніх гмінах павета. У Беластоцкім павеце гэты разрыў між усходнімі — Гарадоцкай і Міхалоўскай гмінамі — і заходнімі бадай удвая большы!

Калі ж глянуць на лікі вясковага насельніцтва ў паасобных гмінах, дык у „ненашых" заўважаецца лёгкую перавагу мужчын над жанчынамі, а ў „нашых" гмінах наглядаецца парытэт. Ці ўжо і нашы мужчыны сталі выязджаць з зямелькі роднай, ці мо занадта разрушылі сваё здароўе тостамі за поспехі?..

Наша Усходняя сцяна — наша Польшча „Б" — усё „расце і буйнее". І даволі відавочная яна ў статыстычным пейзажы.

Аляксандр Вярбіцкі

Пераломная бітва

5 жніўня мінула шасцідзесятая гадавіна бітвы пад Курскам, якая была вырашальнай для лёсаў усходняга фронту ў час II сусветнай вайны. Цягнулася яна ўвесь месяц, на абодвух баках загінула амаль мільён салдат, пры чым упершыню на савецка-нямецкім фронце затраты раскладаліся пароўну. Немцы патрацілі амаль 500 тысяч жаўнераў, саветы — 450 тысяч. Курскую бітву гісторыкі лічаць найбольшай танкавай аперацыяй у гісторыі ўсіх войнаў. На абодвух баках фронту 5 ліпеня 1943 г. стаяла 9 тысяч танкаў. Надзеяй гітлераўскіх генералаў былі цяжкія „тыгры", якія толькі што сышлі з фабрычных канвеераў. Савецкая прамысловасць здолела паставіць 3 тысячы таксама новых Т-34. Абодва тыпы танкаў пад Курскам мелі прайсці своеасаблівае выпрабаванне.

Паміж Арлом і Белгарадам саветы сканцэнтравалі 40 працэнтаў усіх сваіх салдат, немцы — 43 працэнты. Калі б улічыць гарматы, танкі і авіяцыю, тады можна лічыць, што на невялікім адрэзку фронту — 550 кіламетраў — знаходзілася каля 70 працэнтаў ваеннага патэнцыялу. Сталін і Гітлер, а перш за ўсё іх генералы добра разумелі, што тут будуць вырашацца лёсы фронту. Абодва бакі рыхтаваліся да гэтай бітвы ад сакавіка 1943 г. На пачатку гэтага месяца немцы пад Харкавам здолелі цалкам знішчыць савецкую 3 танкавую армію, нанава заняць прастору паміж Дняпром і Данцом. Было гэта пасля сталінградскай бітвы, якая стала сімвалам перамогі Чырвонай Арміі над Вермахтам. Але Сталінград меў больш псіхалагічнае значэнне чым мілітарнае. Саветы пераканаліся, што перамога над нямецкай арміяй магчымая.

Нямецкія генералы, якія заваявалі амаль усю Еўропу, разлічвалі, што іхняя тактыка сканцэнтраваных удараў на вузкім адрэзку фронту танкавымі корпусамі і гэтым разам закончыцца паспяхова. Аднак летам 1943 г. саветы не зрабілі тых памылак што ў 1941 г., калі патрацілі без змагання 3,5 мільёна сваіх салдат. Іх разведка паставіла дакладныя інфармацыі аб стане падрыхтоўкі немцаў і пачатку вялікай вайсковай аперацыі „Цытадэль". Саветы цягам трох месяцаў выкапалі 6 тысяч кіламетраў зямельных замацаванняў, пабудавалі некалькі ліній абароны да 50 кіламетраў углыб тэрыторыі. Калі нават нямецкія танкі перайшлі першую і другую лініі абароны, была яшчэ трэцяя і чацвёртая. Саветы таксама сканцэнтравалі пад Курскам 20 тысяч супрацьтанкавых гармат. Нямецкая стратэгія, якая дазволіла ім разграміць амаль усе еўрапейскія арміі, у гэты раз пацярпела вялікае паражэнне. „Тыгры" без аховы пяхотных войскаў не былі ў змозе разарваць савецкія замацаванні. Гарэлі яны як кансервы з бензінам. Іх рухавікі пры вялікім цяжары танка аказаліся надта слабымі. У спякотныя дні не вытрымоўвалі пастаяннага руху, лёгка загараліся. Тым часам Т-34 цалкам праверыліся. Па тэхнічных параметрах на тую эпоху былі яны амаль дасканалымі. Упершыню савецкая прамысловасць выйгрывала вайну з нямецкай. Сібірскія фабрыкі выпускалі кожны месяц 2 тысячы танкаў і 2,5 тысячы самалётаў. Нямецкія маглі выпускаць толькі каля 60 працэнтаў гэтай прадукцыі.

Бітву пад Курскам выйгралі аднак не савецкія танкісты, але артылерысты і пяхотныя войскі, якія знішчылі амаль палову нямецкіх танкаў. Нешматлікія ўспаміны ўдзельнікаў курскай бітвы так з савецкага, як і нямецкага боку паказваюць больш чалавечае вымярэнне гэтай падзеі. Нямецкае камандаванне апрача гарэлкі выдзяляла сваім салдатам наркотыкі, каб падтрымаць у іх гатоўнасць да змагання. Салдаты, бывала, знаходзіліся ў баі без сну нават і 4 дні. Нямецкія генералы прызнавалі таксама, што з савецкага боку адвага салдат часта межавала з шаленствам. Калі на працягу месяца ў адной бітве загінула амаль мільён жаўнераў, для адных і другіх жыццё сваё і ворага было на другім плане. Саветы абаранялі сваю зямлю і іх матывацыя да змагання была больш зразумелай. Але такую ж волю перамогі гітлераўскай прапагандзе ўдалося таксама прышчапіць і сваім салдатам.

У адрозненне ад Сталінграда, Гітлер пасля месяца змаганняў пад Курскам сам спыніў аперацыю „Цытадэль". Рызыка затраты войск была надта вялікай. Тым часам на поўдні Еўропы амерыканцы і англічане занялі Сіцылію і пачалі паход на поўнач. Італія — саюзнік Нямеччыны — апынулася пад пагрозай. Запасы людзей, танкаў, гармат і самалётаў трэба было пасляць у Італію. На ўсходнім фронце нямецкая армія вымушана была перайсці ў абарону сваіх пазіцый.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Тарасэвіч у цэнзарскім пейзажы

І зноў пракацілася па Польшчы хваля дыскусіі аб тым, „што мастак можа, а чаго яму нельга". У гэты раз праз пластычную інсталяцыю „Пасія" Дароты Нязнальскай з Гданьска, якая спалучыла раўнакрылы крыж з мужчынскімі геніталіямі. Пасля пратэстаў прачуленых на грамадскую мараль каталіцка-правых асяроддзяў, суд выдаў кур'ёзнае рашэнне і пакараў мастачку на паўгода г.зв. грамадска-карысных прац. Папярэдне, гады з два таму (пры ўладзе АВС) стражнікі маралі і прыстойнасці накінуліся з атакай на Анду Ротэнберг, тагачасную шэфіху варшаўскай галерэі „Захэнта". Справа была ў статуі папы прыгнечанага метэарытам. Пасля зорка польскіх тэатра і фільма ў гэтай нацыянальнай галерэі размахваў шабляй у знак пратэсту супраць паказвання тут акцёраў у ролях фашыстаў. Калі пакалупацца ў памяці, то яшчэ раней гэтыя ж самыя асяроддзі маніфеставалі перад кінатэатрамі супраць паказу фільма „Ксёндз", а ў самім толькі Беластоку абурэнне маніфеставалася ў сувязі з пастаноўкай у драмтэатры п'есы „Гусі за вадою" Яраслава Абрамава-Неверлі. Дарэчы, прыкладаў такіх цэнзарскіх цяг можна пералічыць шмат. Больш таго, інспіратары ўсяго гэтага — тыя ж людзі, якія на сеймавых і самаўрадавых форумах прабуюць даказаць, што ў Польшчы няма нацыянальных меншасцей, што Еўрасаюз — толькі пагроза, што „прыйдзе немец з жыдом ды Польшчу выкупяць" і г.д.

У апошні час у гэтым цэнзарскім пейзажы паказалася ў „Выбарчай газеце" інтэрв'ю з Лявонам Тарасэвічам. Прабуе ён тлумачыць польскую мастацка-палітычную рэальнасць. І наколькі ў шмат чым асабіста я згодны з ім, то некаторых спраў я не ўмею ўспрыняць іначай, як правакацыю тыпу „Пасіі" Дароты Нязнальскай. Правакацыя Лявона Тарасэвіча, як гэта з ёю бывае найчасцей, карыстаецца спрошчаннем. Мастак сцвярджае м.інш.: „Калі ў Польшчы ёсць СЛД, то ў нас ёсць падобная фармацыя ў форме БГКТ. У вас ёсць Лешак Мілер, мы маем Яна Сычэўскага. Вы мелі Дэмакратычную унію, мы мелі Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне. Вы маеце Адама Міхніка ды Яцка Кураня, а мы — Сакрата Яновіча". А мне здавалася, што ўсё, што ўпісваецца ў рэчаіснасць у Польшчы, гэта наша польская ды беларуская супольнасць. І тое што добрае, і тое, што благое. І памылкі, і поспехі. І будаванне нашай тутэйшай дэмакратыі, і яе дэструкцыя. На маю думку, такое мышленне Лявона Тарасэвіча вядзе да гетызацыі меншасных асяроддзяў, супраць якой і ён сам. Супольнае перш за ўсё тое, што ёсць творам мастацтва, творам думкі і пачуццяў жыхароў на супольнай зямлі, незалежна ад таго, ці гэта кнігі Сакрата Яновіча, ці карціны Лявона Тарасэвіча, ці інсталяцыі Дароты Нязнальскай. Супольная таксама бяда і базглуздасць дурняў.

Думаю, што праблемы, аб якіх у інтэрв'ю прыгадвае мастак з Валіл-Еўропы-Сусвету не зводзяцца да палітычнай, навейшай гісторыі, а іхняй сутнасцю факт, што палякі ўсё не маюць уражлівасці да меншасці, што выклікае прачуленасць у гэтых другіх, аб чым не раз успамінаў Яцак Курань. Тырчыць у нас, паляках польскай нацыянальнасці, перакананне, якое ўбівалі ў мазгі і эндэкі, і рэальныя сацыялісты, што Польшча гэта краіна адной нацыі, больш таго, Вінкельрыд яна народаў, народ абраны, памазаны.

Частку ідэй Лявона Тарасэвіча ўспрымаю як правакацыю, паводле тлумачэння нашай супольнай знаёмай Анды Ротэнберг: „Правакацыя — заўсёды спроба звярнуць увагу на іншую аптацыю". І так у агульнапольскай, найбольшай газеце размову з мастаком можна ўспрымаць. Але мог бы гэта быць зачатак агульнапольскай дэбаты аб адносінах, гісторыі, польска-беларускай сучаснасці. Аднак, нягледзячы на самасвядомасць палякаў, з палітычных, пэўна, прычын, на гэта зарана і нявыгадна, бо, хочацца ці не, трэба было б крануць суадносіны Польшчы і Беларусі, значыць, міжнародныя суадносіны, якія застаюцца (здаецца, што ў задаволенасці абодвух бакоў) ніякаватымі. Таму інтэрв'ю з Лявонам Тарасэвічам знайшло сваё адлюстраванне на інтэрнэтавых старонках „Газеты", дзе чуліся галасы, якія ў дыскусіі аб г.зв. сутнасці справы ўтапіліся б. Вось, для прыкладу: „Колькі свабоды маюць палякі ў Беларусі, Украіне, Літве ці Ізраілі (...)? Прашу паказаць мне краіну на ўсходзе, якой кіравала б асоба польскага паходжання". А з другога боку: „Цяпер ПКП чыгуначную лінію праз тыя тэрыторыі (Седльцы — Чаромха — Беласток — М. Х.) мае ліквідаваць — гэта антысемітызм якісьці, ці што?". Дыскусія родам з польскага пекла.

І яшчэ адно. Не магу пагадзіцца таксама з тэзісам Лявона Тарасэвіча, што на Беласточчыне не захавалася ніякая беларуская эліта. Незалежна ад таго, ці любім яго ці не, яна гэта хоць бы і Сакрат Яновіч, ці сам Лявон Тарасэвіч, якога адна з карцін была м.інш. падарункам „Выбарчай газеты" Гюнтэру Ферхойгену, які дапамагаў Польшчы ў перамовах з Еўрасаюзам. „Ваш" Адам Міхнік у канцы мая пры нагодзе гэтай урачыстасці сказаў: „Да граматы прызнання далучаем прэзент — прыгожую карціну Лявона Тарасэвіча, мастака, які сімвалізуе традыцыю Рэчы Паспалітай шматлікіх народаў (...). Гэты дар мае быць сімвалам удзячнасці, якую выказвае вам Польшча. Гэты дар — таксама рука працягнутая народам, якія пражываюць на ўсход ад польскай мяжы — беларусам, украінцам. Там таксама Еўропа".

Мацей Халадоўскі

Пацешылі і... ад'ехалі

25 ліпеня на Чаромхаўскай станцыі праводзілася рэкламная кампанія новага рэйкавага аўтобуса. У пасёлак завіталі высокія чыгуначныя чыноўнікі, прадстаўнікі ваяводскай і павятовай адміністрацыі, мясцовы самаўрад ды шматлікая публіка. Пасля афіцыйных выступленняў прысутныя змаглі паглядзець „камфартабельную цацку", як і пракаціцца на ёй па станцыі. Чарамшане цешыліся, што неўзабаве на такой машыне будуць падарожнічаць кожны дзень на шляху Беласток — Чаромха — Гайнаўка. Ноч аўтобус прастаяў у перонах і зацікаўленыя маглі яго агледзець. Наступнай раніцы госці падаліся ў Гайнаўку, а пасля — у Беласток.

Правёў я кароценькую размову з дырэктарам Прадпрыемства рэгіянальных пасажырскіх перавозаў у Беластоку Галінай Кужынай. Цікавіла мяне справа не камфорту язды, колькі яе хуткасці. Дырэктар пацешыла, што пасля далучэння Польшчы да еўрасаюзных структур, калі знойдзецца стратэгічны інвестар, дык і шлях Белавежа — Гайнаўка — Бельск-Падляшскі будзе вернуты ў карыстанне. Пакуль, гэта аптымістычны прагноз. Дырэктар Кужына здавалася быць пакрыўджанай за тое, што некаторыя чарамшане абвінавачвалі яе ў нелаяльнасці і падпісанні дамовы з ПКС, што ў выніку прывяло да ліквідацыі чыгуначных ліній на Беласточчыне. „Ніякіх паёў у ПКС у мяне няма, — заявіла дырэктар. — У гэтай справе давала я пісьмовыя абвяржэнні. Можна праверыць".

Рэкламная кампанія закончылася, госці ад'ехалі, забраўшы з сабою „камфартабельную цацку". Чарамшанам пакінулі старыя вагоны і абяцанкі, што ў будучыні змогуць падарожнічаць новым чыгуначным транспартам.

Уладзімір Сідарук

Жаўрукі

Легенда

Старэйшыя людзі казалі, што калісь даўно ішоў па зямлі беларускай Бог. Прытаміўся ён ды прысеў каля старога гасцінца, недалёка ад якога араў зямлю селянін. А зямліца тая — адзін пясок ды камяні. Стаміўся араты, ажно кашуля на спіне змакрэла ад поту салёнага. А конік у таго селяніна ледзьве цягнуў саху драўляную...

Павіталіся Бог з аратым, потым размова пацякла паміж імі... Запрасіў араты добрага чалавека папалуднаваць разам з ім. А ежа тая — акрайчык хлеба ды вада крынічная.

Папалуднавалі хлебам Бог з аратым. Выцірае Бог вусны ды пытае ў селяніна пра яго жыццё, можа якую палёгку той мець хацеў бы.

— А ніякай палёгкі не трэба. Вось толькі надакучыла слухаць, як каменне аб саху шкрэбае ды грукае, хоць ты вушы затыкай.

Падзякаваў Бог аратаму. А той за лейцы ўзяўся ды далей гараць пачаў. І тады падняў Бог з узаранай зямлі каменьчык ды кінуў высока ў неба. Толькі кінуў — ператварыўся каменьчык у маленькую птушачку, якая зашчабятала ў блакіце неба.

Вось з той пары, як толькі выходзіць вясною араты ў поле, пачынае цешыць ягоную душу сваім шчабятаннем жаўручок. А гняздо сваё гэтая маленькая птушачка каля поля робіць. Як ідзеш, дык не раздушы нагою гняздо тое, бо ў ім, падобныя на маленькія каменьчыкі, птушаняткі сядзяць.

Водар жыцця

Калі малы быў, старэйшыя людзі казалі, што вёску маю Дыхнавічамі назвалі, бо багніна калісь недалёка была, і, калі па-над ёю ўздымаўся туман, дык здавалася людзям, што дыхае балота. Ад слова дыхаць і назва вёскі пайшла. Можа яно і гэтак. Гады праляцелі, знікла багніна тая (а можа і не было яе зусім), а вось водар паветра заўжды па-над вёскаю. Зімою насычана паветра хваёвым водарам, вясною — водарам свежай травы, маладымі лісткамі ды сокам бяроз, а ад густога паху бэзу, чаромхі ды тапалінага лісця галава ідзе кругам. Летам працаўніцы пчолы нясуць на крылах ліпавы пах, калі ляцяць у свае вуллі па-над духмянаю сенажаццю. Апаўшым лістом, спелым яблыкам ды дымам кастра пахне восень.

— Прыязджаю дамоў і надыхацца не магу, — не адзін раз чуў словы быўшых дзяцей вёскі, а цяпер гараджан. Дык вось табе і адказ: „Проста дыхаць лёгка ды прыемна ў гэтых мясцінах — па гэтаму і Дыхнавічы".

Іншы раз здаецца, калі б Жаўрукамі вёску назваў бы, таксама напэўна не памыліўся б. Праз хату-другую сем'і з прозвішчам Жаваранак раней жылі і цяпер жывуць. А мо адзін корань яны ўсе маюць. Ды згубіўся корань той радавы ў даўніне вякоў, быццам корань магутнага дуба ў зямліцы беларускай, — паспрабуй тут разбярыся. А можа араты той, што з Богам папалуднаваў і быў прашчурам сённяшніх Жаваранкаў? Дык не ведаю ж гэтага я.

Ля старой студні

Ён быў зусім малы — 6 гадкоў споўнілася дзіцяці. Стаяў босымі ножкамі на вільготнай ад ранішняй расы траве, ля студні, у кароткіх штоніках з шлейкаю праз плячо, якая зашпілена была на вялікі гузік. Хударлявыя рукі хлапчаняці былі апушчаны, павекі часта міргалі, а бялёсыя валосікі тырчэлі ў розныя бакі на маленькай галоўцы, да якой было прыціснута чорнае дула аўтамата.

— А паночкі, ён жа зусім маленькі, ён жа нічога не разумее аб чым вы гаворыце, мяне, старую, лепей застрэльце. — Баба Пілілпіха, стаўшы на калені і склаўшы далоні бы перад абразамі, просячы глядзела на чорную постаць эсэсаўца. Той дулам аўтамата піхнуў у беленькую галаву, ад чаго хлапчаня, зачапіўшыся за камень, упала, выцягнуўшы на бліскучай ад расы траве маленькія ручаняты. Малы не заплакаў, а толькі мацней прыціснуўся да зямлі, пахіліўшы галаву да плячэй і заплюшчыўшы вочы.

Баба Пілілпіха падхапілася з калень, падбегла да дзіцяці, прысела і быццам тая перапёлка, што хавае пад крылом сваім птушаня, фартухом накрыла малое, быццам фартух той мог зберагчы дзіця ад нямецкай кулі.

Ноччу хлапчук крычаў праз сон і што бабы ні рабілі — свечку пад абразы ставілі, вадою перапалох адлівалі — крычаў малы сярод чорнай ночы.

Быццам той пясок скрозь пальцы працяклі гады жыцця, у колер попелу валасы пафарбавалі. Дзеці выраслі, ды што там дзеці — унукам ужо больш гадкоў, чым было тады яму, калі стаяў ля студні пад дулам нямецкага аўтамата. Памяць быццам на кінастужцы зафіксавала тыя моманты, калі ў хату, грукаючы абцасамі, увальваліся фашысты, на форме якіх блішчэлі бляшаныя дубовыя лісты. Карнікі забяруць на здзекі ў Ваўкавыскае гестапа, а потым у канцлагер бацьку — Жаваранка Аляксандра Пілілпавіча, ні перад кім, ні ў чым невінаватага.

Падрасце — даведаецца і пра Ваўкавыскае гестапа, у якім дзве аўчаркі насмерць загрызлі палонных. Калі ў хату заходзілі карнікі — сястрычкі хлапчука забіваліся ў цёмныя куточкі хаты, а ён у шэсць гадоў стаўшы самым старэйшым мужчынаю ў хаце, выходзіў на сярэдзіну пакоя і, гледзячы дзіцячым блакітам вачэй на чорныя постаці фашыстаў, стукаў маленькім кулаком сабе ў грудзі, казаў: „Ну дальбог німа нікога". Малое, як магло, бараніла сваіх застаўшыхся ў жывых, родных. Бараніў, бо ўжо бачыў як расстрэльваюць ні ў чым непавінных мірных жыхароў.

Птушаняты

Калі ў вёску, быццам тыя крумкачы чорныя, наляталі ўласаўцы, сэрца Надзеі трывожна стукала ў грудзях. Што будзе? Вось ужо больш чым месяц вісіць нямецкая абвестка каля солтысавай хаты, што за мужа яе, Жаваранка Івана Пілілпавіча жывога ці мерцвяка нямецкія ўлады ўзнагароду гарантуюць — 10 000 марак і 14 пудоў цукру. І знаходзяцца нелюдзі, якія граху смертнага на душу браць не баяцца — тыдзень таму старая кабета зяцёў, быццам сабак з ланцуга на параненага вайскоўца што з лесу выйшаў ды вады паспытаў, нацкавала.

— Лаві яго! Гэта ж Жаваранак! Закалолі зяці віламі, што гной выкідалі, маладога салдата. На воз мерцвяка ўскінулі ды ў Рось на апазнанне павезлі. Узнагароду пачвары атрымалі (праўда не 14 пудоў, а 2 мяхі цукру), бо той забіты хлопец не яе Іванам аказаўся. Кожны дзень просіць Божачку Надзея, каб жывы Іван застаўся. Шасцёра ж дзетак у іх, адзін за другога меншыя, быццам тыя гарошынкі маленькія.

Уздрыганулася жаночае сэрца, сціснулася ад болю і ад адчаю, калі з грукатам, ад удару кованых ботаў нямецкіх прысцябаяў расчыніліся дзверы хаты.

— Збірайся, сучка, і вывадак свой за сабой вядзі! — гаркнуў Новік ды клоцнуў затворам вінтоўкі.

Дзеці заплакалі, паглядаючы спалоханымі вачамі на маці, трымаліся за яе сукенку.

— Не плачце, не бойцеся, мае харошыя. — Надзя, як магла супакойвала сваіх крывінак.

— А мы зараз прыгожа-прыгожа апранемся — нацягваючы кашулькі на маленькія дзіцячыя ручкі, цалуючы і паліваючы іх слязамі ціха шаптала Надзя. Потым, зусім другім, жорсткім голасам да Новіка з Дыгертам:

— Ад вас нікуды не ўцяку, — дайце ў чыстае пераапрануцца.

Калі Надзея ішла па вуліцы вёскі, свежы ветрык, быццам хацеў супакоіць жанчыну, высушыць слёзы на яе твары, прыўзнімаў пасмы валасоў, якія Надзея адхіляла адною рукою, а ў другой трымала малое, якое абвіло яе шыю маленькімі ручанятамі.

На канцы вёскі, куды карнікі пазганялі ўсіх вяскоўцаў, жанчына, якая была да гэтага моманту быццам каменная, замітусілася, адпіхваючы ў бок людзей хлапчука, які падышоў да яе. Гэта быў яе сынок Лёнік, які толькі што прыйшоў ад кароў, што пасвіў. Але не паспеў хлопчык схавацца ў натоўпе людзей, бо дужая мужчынская рука раптам схапіла яго за каўнер і піхнула да маці, маленькіх братоў і сясцёр.

— Куды! І ты ідзі да іх. — Гэта быў дзядзька Вінцуль, які піхнуў хлопчыка пад нямецкую кулю.

Эпілог

Дзецюкоў тых, што салдата маладога віламі закалолі — расстралялі, а цукар, смерцю салдацкаю зароблены, ля іх і высыпалі. І стаў ён ад крыві нелюдзяў чырвоны. Да канца свайго жыцця старая ад салодкага галаву адварочвала — рыгала. Род, які ад яе пайшоў — знік. Дзядзька — нелюдзь, які малое на смерць падпіхнуў, які потым з бандытамі з абрэзам па лесе поўзаў, у турме адседзеў і сын яго адседзеў і ўнук па турмах павалэндаўся. Ні павагі да роду гэтага з боку людзей, ні слова добрага. У трэцім пакаленні, пачынаючы ад дзеда — вырадка, знікае іх род.

Расстраляную кабету з дзецьмі загадалі карнікі на могілках не хаваць, а далёка за ровам, без трунаў, закапаць у зямлю, быццам сабак. Выкапалі людзі магілу за ровам, але ўпрыгожылі яе самымі найлепшымі дыванамі, якія ў хатах іхніх былі. Прайшоў час і стаіць магілка мамы з дзяцьмі ў самой сярэдзіне могілак. Быццам абступілі яе людзі ўжо пасля сваёй смерці, просячы прабачэння ў малых, што ў час той ліхі, зберагчы іх ад смерці не змаглі.

Вясна. Зранку паветра аж звініць ад цішыні. На полі дзе-нідзе шэрымі акрайчыкамі ляжыць апошні снег. Пройдзе гадзіна-другая і нічога не застанецца ад гэтай звонкай цішыні — сонца мякка абдыме наваколле, узрадуюцца жэўжыкі ручаі ды весела балбочучы напояць сабою рачулку. А потым пабягуць згубіўшыся ў ёй аж да самага бацькі нашага Нёмана. І раптам аж задрыжыць паветра ад трапяткой кропачкі ў небе. Смяецца, гуляе ў небе жаўручок і іншы раз здаецца мне, што душы дзетак тых, расстраляных, такімі ж жаўручкамі ў небе гуляюць.

Пятро Акулік

Дыханне пушчы

Сёлета Белавежу наведвае больш індывідуальных турыстаў і экскурсій чымсьці ў мінулым годзе. Праваднік па Белавежы і пушчы Раман Алексяюк пацвердзіў, што ў ліпені белавежскім праваднікам не было калі адпачываць.

Турысты для прагулкі ахвотна наймаюць конныя брычкі або акумулятарныя вазкі і веласіпеды. Некаторыя вузкакалейкай ездзяць у Тапіла.

Пакуль турысты дабяруцца ў Белавежу, па дарозе могуць паглядзець паказны запаведнік, у якім жывуць зубры, алені, сарны, ваўкі і дзікі. Прыезджыя ахвотна наведваюць „месцы моцы", якія выпраменьваюць пазітыўную энергію.

Варта выбрацца на экскурсію „шляхам каралеўскіх дубоў" ва ўрочышчы Старая Белавежа, дзе расце каля трыццаці векавых дубоў.

На заканчэнне экскурсіі можна пайсці ў Прыродазнаўча-лясны музей БНП, паглядзець Паляўнічы дом з 1845 г. у Палацавым парку, у якім зараз знаходзіцца Асяродак прыродазнаўчай адукацыі БНП (на здымку). Гэта найстарэйшы будынак у Белавежы.

Янка Целушэцкі

Фота Янкі Целушэцкага

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Рукадзельніцы з выцінанкамі

Жніво і рукадзелле

— Калі два галубкі звернутыя да сябе дзюбкамі, значыць — узаемнасць. Калі яны адвернутыя — каханне няшчырае, — Наталля і Юстына расказваюць мне пра сімволіку ў народных вышыванках і выцінанках. — Чаму пра галубоў — бо іх найбольш на падляшскіх вышыванках.

Усе дзяўчаты — іх сем — прызнаюцца, што найбольш спадабалася ім вышыванне.

— Я зрысавала многа ўзораў, — адзначае Юстына, — і цяпер вольны час буду праводзіць за вышыўкай. На пачатак простыя ўзоры, пасля больш складаныя.

— Ці вышыўка ў вас у крыві?

— Ёсць штосьці, што ўцягвае, — прызнаюцца гімназісткі, — бярэш у рукі іголку, ніткі, пачынаеш узор і не можаш адарвацца. Гэта ўзор цягне — каб далей, каб пабачыць як выйдзе.

На Першых варштатах рукадзелля і спеву, якія з 21 па 26 ліпеня г.г. праходзілі ў Студзіводах, дзяўчаты вучыліся ткаць, вышываць, выконвалі аздобныя выцінанкі і спявалі старыя падляшскія песні.

— Ткацтва найбольш складанае, — дзяўчаты не скрываюць захаплення для працы ля ткацкага станка. — Гэта не вышыўка, якой можна займацца на хаду. Тут трэба павучыцца пад вокам спрактыкаванай майстрыхі. Разам з дзяўчатамі працавалі дасведчаныя рукадзельніцы: Марыя і Антаніна Сцепанюк ды Марыя Красоўская; з выцінанкай знаёміў народны мастак з Крывой — Анатоль Краўчук.

Гаспадар і арганізатар варштатаў, Дарафей Фіёнік, не быў бы сабой, калі б не падрыхтаваў сюрпрызаў. Спецыяльна маладым рукадзельніцам паказаў, як калісьці нашы продкі зажыналі жыта. Дзяўчаты навучыліся звязваць снапкі пярэвясламі. Ну і, вядома, паліліся жніўныя песні.

— Я толькі цяпер даведалася, як нашы продкі цяжка працавалі, — адзначае Наталля. — Каб адпачыць ад жары і працы, дзяўчаты спявалі жніўныя песні.

— Найфайнейшая мілая атмасфера, — адзначаюць усе, — мы тут адпачываем і вучымся, як карысна правесці вольны час.

На заканчэнне варштатаў — яшчэ адзін сюрпрыз: веласіпедная экскурсія.

— Мы наведаем царкву ў Падбеллі і святое месца ў Кнарыдах. Пабачым, якое месца і значэнне займаюць народныя вышыванкі і дываны ў нашых цэрквах.

Ганна Кандрацюк

Аляр'ян Дзеружынскі

Праліўны дождж

Дождж ударыў
Праліўны.
— Но, мой конік
Вараны!

Конь бярозавы
Імчыць,
Гром грукоча
І вурчыць.
З неба — іскры
І агонь.
Пад паветку
Скочыў конь.
Мы схаваліся
З канём,
Пачакаем,
Адпачнём.

Сонца выглянула
З хмары,
Над зямлёй
Клубіцца пара.
Дождж прыціх...
Я на кані
Еду, —
Вецер, дагані!

Ніна Мацяш

Грэчкалюбы

Пайду, пасяджу
на беразе рэчкі,
Там пасеяў вадажук
вадзяную грэчку.

Між сасонкі вадзяной
ды між вадакрасу
З вадажучыхай сваёй
жне яе ўжо ўзасаб.

Панясуць яны дамоў
ураджай багаты,
Наядуцца грачаноў
з вадзяной салатай.

Віктар Швед

Запалка

Спытаў настаўнік Еву:
— Ці можаш нам раскрыць,
Якое знаем дрэва,
Што нам найлепш гарыць?

З падказкаю Міхалка
Прыходзіць найхутчэй:
— Гарыць жа нам запалка
Найлепш і найярчэй.

Лянівы сабака

Скардзіцца знаёмым Якаў:
— Лянівы надта наш сабака.
Калі сабакі, прынялося,
Нам прывязь у зубах прыносяць

Як хочуць выйсці на прагулку,
Нават у нейкі горад гулкі,
А мой сабака нам няспынна
Прыносіць ключык ад машыны.

Пра лёс і багатага Марка

(Беларуская народная казка)

Ідуць па свеце Бог і святы Ілья. Зайшлі да багатага Марка.

— Прымі нас гаспадар нанач, — просяць, — ноч на двары, у лесе ваўкі ганяюцца.

Марк зірнуў на ўбогае адзенне вандроўнікаў, падумаў і адказаў:

— А што то — у мяне зорны палац, каб кожнага бадзягу нанач прымаць?

— Ну што ж...

Вандроўнікі пакланіліся і пайшлі.

У канцы вёскі бабуля перайшла дарогу, яна была маткай багатаму Марку.

— Заходзьце, калі ласка, адпачыць, — запрасіла. — Будзе начлег і вячэра.

Бабка накарміла вандроўнікаў і спаць паклала.

У дванаццаць гадзін у шыбу пастукаў анёл і пытае:

— Госпадзе! У беднага Фамы сын нарадзіўся, — якое яму шчасце даць?

Бог падняў галаву, падумаў і кажа:

— Дай яму багацце Марка.

Бабуля не спала і ўсё чула. Яна не магла ўцяміць, што тут дзеецца — ці сон прысніўся, ці Бог з анёлам гаворыць? Сон, відаць, сон — паўтарала. Усю ноч не спала, паўтарала: „Сон, сон...”

Раніцай вандроўнікаў накарміла і ў дарогу адправіла. Сама чым хутчэй да сына схадзіла, усё расказала.

Рассмяяўся багаты Марк.

— Калі так, — рашыў — пайду і заб'ю дзіця Фамы.

Пайшоў Марк да Фамы, нібыта з добрай навінай. А ў беднага васьмёра дзяцей у хаце. Галодныя, зап-

Вавёрка пакрыўдзілася

(Быль)

Здаецца, добра ведаю лясных звяроў і птушак. А яны час ад часу здзіўляюць па-новаму, як людзі.

Антаніна Сямёнаўна жыве ў вёсцы Пасталы, што ў Жыткавіцкім раёне. Працуе настаўніцай у суседняй вёсцы. Разам, як радня, сабраліся елкі, хвоі, арэшыны. На разгалістым дубе каля самай сцяжынкі аблюбавала сабе жытло вавёрка. Хавае ў дупле-каморцы запасы на зіму — шышкі, арэхі. Яна прывыкла да людзей і не ўцякае, калі хто-небудзь праходзіць міма.

Ніколі не палохала вавёрку і Антаніна Сямёнаўна. А гэта — як здзяцінела: моцна затупала нагамі, сярдзіта зашыпела на яе, ціхую і даверлівую. Вавёрка нейкі міг глядзела на яе здзіўленымі вачыма, а потым стрымгалоў сіганула ў дупло.

Занятая клопатамі ў школе, Антаніна Сямёнаўна забылася пра вавёрку. А калі вярталася дадому, пад дубам на яе ўпала шышка. Азірнулася: нікога не відаць. Падняла галаву і ўбачыла на галіне вавёрку: „Няўжо яна кінула шышку? — здзівілася. — Не можа быць".

Назаўтра зноў праходзіла пад дубам. І зноў на яе ўпала шышка. Цікава, падумала, ці „абстрэльвае" вавёрка іншых людзей. Папыталася ў дарослых, у вучняў. Аказваецца, не, толькі яе запомніла вавёрка.

„Трэба абхітрыць звярка", — вырашыла Антаніна Сямёнаўна. Надзела новую сукенку, павязала новую хустку. Але збіць з панталыку вавёрку не ўдалося: на галаву зноў упала шышка.

Бачыце, якая крыўдлівая вавёрка жыве ў Жыткавіцкім раёне. Калі будзеце там, пастарайцеся прайсці пад дубам ціха, каб потым на вас не падалі шышкі.

Уладзімір Шулякоўскі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Аляксандра

Волечка Сцепанюк хвалявалася і ўголас думала: „А ці атрымаю ўзнагароду?!". Трэцякласніца, як многія дэкламатары, марыла пра поспех у конкурсе „Роднае слова". Яна падрыхтавала казачку А. Архімовіч „Першае яечка". Сказаць казку, хай і вершаваную — не простая задача. Калі твор доўгі, трэба многа ўвагі, каб не згубіць ці зблытаць радкі.

Чамусьці ў нас прыжылося меркаванне, што казку павінны расказваць дзядуля ці бабка. Праўда, казкі старэчаў маюць свой непаўторны клімат. Літаратурныя апрацоўкі падабаюцца дзецям, яны нават расказваюць іх малодшым брацікам ды сёстрам.

У ролі казачніка Оля Сцепанюк з беластоцкай „чацвёркі" заслужыла пяцёрку. Яна — лаўрэатка другога месца ў Нараўцы.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Мацей

На сцэне Нараўчанскага дома культуры некалькі разоў прагучэў верш Васіля Віткі „Доктар смех". Гэты твор чамусьці спадабалі хлопцы. Верш хаця і паўтараўся, аднак кожнае выкананне мела індывідуальны характар.

Мацек Карчэўскі з беластоцкай „чацвёркі" спрабаваў адлюстраваць гумар і гульню слоў у вершы. Мацек як „стары" дэкламатар і акцёр у адной асобе, рассмяшыў і захапіў публіку ды камісію. Ён — лаўрэат трэцяга месца на цэнтральным этапе конкурсу „Роднае слова".

Беластоцкі пяцікласнік мае шчасце, сярод найбольшых фанатак яго таленту — класныя сяброўкі.

— Мацек, файны калега, — паўтаралі дзяўчаты і ўсміхаліся.

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 32

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

►		▼		▼	Szkic	▼	Okular	Zaliczka
Pożar	Galaretka / Pan		Reportaż / Lekcja	►				▼
Słup	► ▼		▼		Klasa		╳	
Tłumaczenie	►				▼		╳	
╳		Orla ►					╳	
Lekarz	►						╳	
Pomarańcz (kolor)		╳	As ►			╳	╳	
►					Sęk ►			

Адказ на крыжаванку н-р 28: Квас, малако, луг, шпак, макаўка, акно, паварот. Маланка, лук, загадка, котка, пакет, аса, крона.

Узнагароду, **аўтаручку**, выйграў **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!

Вясёлы куточак

— Чаму бусел стаіць на адной назе?

— Бо калі б падняў другую, то перакуліўся б.

* * *

— Чаму лебедзі маюць такія доўгія шыі?

— Каб не патапіліся вясною, калі пасля таяння снегу павышаецца ўзровень вады.

* * *

— Бабулька! Настаўнік на ўроку рэлігіі сказаў, што Бог прысутны ўсюды. А ці ў Кавальскіх у краме таксама?

— Таксама, — адказвае бабулька.

— А дудкі праўда: у Кавальскіх няма крамы!

лаканыя. А тое, што нарадзілася — дзевятае.

— Аддай мне яго на выхаванне, — пачаў багаты, — падгадую, у людзі выведу. Як роднае.

Падумаў няшчасны Фама, падумаў і зірнуў на чараду аголеных і галодных дзетак... Ну і аддаў немаўля.

Тры месяцы гадаваў багацей немаўля, перад людзьмі добрым бацькам прыкідваўся. А ў галаве план даспяваў — як тут дзіця са свету звесці. Урэшце прыдумаў. Узяў бочку, напхаў у сярэдзіну сена, паклаў малога і на рэчку пусціў. „Будзе плысці, разаб'ецца і ўтопіцца малыш", — зацёр рукі Марк.

Увесь дзень плыла бочка, аж у кустах завязла. Пад вечар малы прачнуўся, стаў плакаць. А там недалёка манастыр стаяў. На беразе манашкі бялізну палакалі. Пачулі плач і дзіця знайшлі. Прынеслі малога ў манастыр, заапекаваліся, выгадавалі, пісьменнасці і розуму яго навучылі.

Пачуў пра ўсё багаты Марк. Напалохаўся. Едзе ў манастыр.

— Мне б вашага хлопца ў сыны ўзяць, — кажа, — сваіх дзяцей няма, багацце ў добрыя рукі каб каму перадаць. А вам вагон белай мукі за маладзёна дам, грошы на царкву выкладу.

Падумалі манашкі ды і пытаюць хлапца:

— Як табе — падыходзіць?

— Падыходзіць, — адказвае — як ваўка ў лес, у народ цягне.

Сеў у брычку і да багатага Марка ад'ехаў. Тут яго прыёмным сынам запісалі.

— Едзь у млын і змялі пшаніцу на муку манашкам — папрасіў гаспадар-бацька.

У млыне чэрці працавалі, усе яны Марку служылі. Перад ад'ездам багацей даў хлапчуку запіску і загадаў старшаму даручыць. А там напісаў: „Змяліце тую пшаніцу і маладзёна разам. Каб і следу не засталося!"

Па дарозе анёл памяняў запіскі.

„Хлапца як цара прыняць, угасціць і дамоў адправіць — а муку ўсю ў манастыр".

У млыне здзівіліся загаду гаспадара — добрыя справы знішчальныя для чэрцяў. Усё ж, як верныя слугі, зрабілі як на паперы загадана.

Вяртаецца хлапец дахаты, вясёлы, песню спявае. Багацей на дарогу выйшаў і ад гневу затросся.

— Відаць, канец мне, — падумаў. — Ужо і чэрці не слухаюць!

Тры дні не еў, не піў наш Марк. Раніцай новую гібель прыдумаў. Пасылае прыёмнага да чараўніка.

— Едзь, — кажа, — завязі ад мяне запіску і рабі ўсё што стары скажа... (у лісце папрасіў чараўніка, каб той паклікаў на маладца смерць).

На беразе рэчкі хлопец сустрэў дзядулю.

— Сынок, — просіць сівы дзядок, — перавязі мяне на другі бераг.

— Сядайце, дзедка, — адказаў хлопец і запрасіў старога ў чаўно. Як плылі, Бог запіску падмяніў. Цяпер яна пісала: „Пасланца прыняць і як цара ўгасціць. Хай вернецца ў мой двор з багаццем і галавой тваёй!"

Усхваляваўся чараўнік як запіску ад Марка прачытаў. Ніхто яшчэ так яго не прынізіў, ніхто так ім не кіраваў.

— Вяртайся дахаты, — адправіў маладзёна стары, — а сам смерць паклікаў.

— Ідзі да багацея, — папрасіў белую даму, — ідзі і скасі дурны Маркавы чэрап!

Калі хлапец вярнуўся ў двор, Марка ўжо не было ў жывых. Людзі расказваюць, што ў час навальніцы забіла яго маланка.

Так багацце Марка на Фамавага сына перайшло. (гак)

Фота з архіва ГГАК у Кляшчэлях

Самадзейніцы з Дашоў на Аглядзе вясельных абрадаў, восень 2002 г.

Хочам адукаваць інструменталістаў

Пра культуру ў Кляшчэлях з дырэктарам Гмінна-Гарадскога асяродка культуры МАРЫЯЙ КЛІМОВІЧ размаўляе Міхал Мінцэвіч.

— ***Чым займаецца ваш асяродак?***

— У ГГАК працуюць тры асобы: я, інструктар Яўгенія Казімерук і на паўштата настаўнік музыкі Ігар Фіта, які працуе з кляшчэлеўскімі маладзёжнымі і фальклорнымі калектывамі. Ад двух гадоў навучаем дзяцей і моладзь (IV клас пачатковай школы — III клас гімназіі) ігры на інструментах (піяніна, гітара, акардэон); у мінулым навучальным годзе заняткі наведвала 23 асобы (платнасць — 20 злотаў у месяц ад аднаго навучэнца).

На тэрыторыі гміны працуюць тры фальклорныя калектывы — у Дабрывадзе, Дашах і Кляшчэлях — у якіх спяваюць дарослыя жанчыны, а пры ГГАК маладзёжныя: „Тырса" і паўстае новы інструментальна-вакальны, але невядома, ці апошні прадоўжыць дзейнасць пасля канікул.

Утрымоўваем таксама дзве футбольныя каманды, але ад восені — у выніку дэградацыі ў ніжэйшы клас (з „А" ў „Б") астанецца толькі адна.

— ***Ці хапае вам грошай?***

— На патрэбы культуры гмінна-гарадскі бюджэт адводзіць нам каля 100 тысяч злотаў. Прыдалося б і больш, не маем, напрыклад, камп'ютэра.

— ***Якія праводзіце мерапрыемствы?***

— У гэтым годзе „Дні Кляшчэль": 2 жніўня з'езд Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі і 24 жніўня народны фэст. Наша таварыства, якое налічвае шэсцьдзесят чалавек, працуе ўжо сем гадоў. Выпусцілі мы зборнік вершаў нашай зямлячкі Ядвігі Карпюк, якая цяпер пражывае ў Нараўцы. Выдаем альбом „Дабрывада ў графіцы — захаваць ад забыцця" аўтарства некалькіх студэнтаў Факультэта архітэктуры Беластоцкай політэхнікі. У ліпені ў нашым асяродку працавала фотавыстаўка „Прыродныя каштоўнасці гміны", на якой былі паказаны працы Марка Мартыновіча, Яраслава Сідуна і мае. З нагоды з'езда Таварыства пакажам выстаўку мінералаў і каранямастацтва.

— ***Ці на час летніх канікул ГГАК прапануе вучням нейкую спецыяльную праграму?***

— Не. Праграмай на канікулы з'яўляецца адпачынак на вадзе. Мы не ў змозе арганізаваць заняткі ў ГГАК, бо ў той час арганізуем працу плавальнага басейна ў Кляшчэлях, а ў гэтым годзе дайшла нам чарговая нагрузка — вадаём у Рэпчычах, якога працу трэба было арганізаваць з азоў.

— ***Ці новы вадаём дае прыход?***

— Не. Прадаем білеты: па два злоты дзецям і па чатыры дарослым, але шмат каштуе ўтрыманне вады.

— ***Ці хочаце пра нешта паведаміць чытачам „Нівы" ў сваёй гміне?***

— Заахвочваем дзяцей да навукі і ігры на музычных інструментах. Мы вельмі хочам адукаваць інструменталістаў для нашага асяроддзя.

— ***Дзякую за размову.***

Вяртанне спадчыны

У беларускую культуру і навуку паволі вяртаюцца імёны, якія па ідэалагічных прычынах не былі ў іх прысутныя на працягу апошніх дзесяткаў гадоў. Напрыклад, навуковая спадчына Міколы Шкялёнка была дагэтуль вядомая толькі вузкаму колу даследчыкаў. Нядаўна выдадзеная Беларускім гістарычным таварыствам у Беластоку кніга гістарычных нарысаў Міколы Шкялёнка* прыбліжае творчыя дасягненні гэтага гісторыка, публіцыста і дзеяча, які ў Савецкай Беларусі прыгавораны быў на забыццё.

Мікола Шкялёнак (1899-1946) — выпускнік юрыдычнага факультэта Віленскага універсітэта — у студэнцкія гады ўдзельнічаў у беларускім руху, быў старшынёю Беларускага студэнцкага саюза і рэдактарам „Студэнцкай думкі". Пасля заканчэння вучобы ў 1932 г. працаваў адвакатам у Вільні і быў сакратаром Беларускага навуковага таварыства. Даследаваў гісторыю Беларусі, выступаў з дакладамі перад сябрамі Таварыства прыяцеляў беларусаведы і друкаваў іх у перыёдыцы.

Мікола Шкялёнак праяўляў актыўнасць і на палітычнай ніве. У канцы трыццатых гадоў быў адным з заснавальнікаў Беларускага нацыянальнага фронту, які стаяў на аснове незалежнасці Беларусі і выступаў супраць антыбеларускай дзейнасці камуністаў. Перад заняццем Вільні бальшавікамі Шкялёнак разам з Вінцуком Гадлеўскім уцяклі ў Варшаву, адкуль Шкялёнак накіраваны быў у Берлін у газету „Раніца" (з сакавіка 1942 г. стаў яе галоўным рэдактарам). У Берліне арганізаваў Беларускі камітэт самапомачы ў Нямеччыне. У лютым 1943 г. Шкялёнак пераехаў у Мінск, дзе, апрача рэдагавання „Беларускай газеты", засядаў у Беларускай Цэнтральнай Радзе на пасадзе віцэ-прэзідэнта. На Усебеларускім кангрэсе ў Мінску 27 чэрвеня 1944 г. выступіў з дакладам „Аб прызнанні за няважныя пастановы ўраду СССР і былой Польшчы, якія датычацца Беларусі, яе тэрыторыі і народу". Пасля вайны трапіў у рукі НКУС і ў 1946 г. як „памагаты фашыстаў з ліку беларускіх буржуазных нацыяналістаў" быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны.

У наш час упершыню артыкул „Аб «Тутэйшых»" Міколы Шкялёнка надрукаваны быў у выдадзенай у 1998 г. у Варшаве анталогіі „Беларуская думка XX стагоддзя". І хаця з моманту напісання яго прайшлі 64 гады, тэзісы аўтара далей захоўваюць актуальнасць. Вось фрагмент: „Вернемся цяпер да пытання, шляхам пашырэння якой асветы „тутэйшыя" могуць быць нацыянальна асвядомлены? Адразу для нас робіцца ясным, што ні асвета польская, ані расейская не могуць быць асведамляючым нацыянальна дзейнікам, бо само паняцце „тутэйшасці" паўстала як процістаўленне да польшчызны або расейшчыны!". Шырокая падборка гістарычных прац Міколы Шкялёнка — 16 твораў — даецца ў новавыдадзенай кнізе „Беларусь і суседзі". У ёй побач выдатных прац („Беларусь — Літва — Крывія", „Копныя суды ў Беларусі" ці „У трохсотыя ўгодкі смерці вялікага канцлера Льва Сапегі") змешчаны таксама меншыя формы — выступленне, рэцэнзія. Тытульны артыкул „Беларусь і суседзі", прысвечаны адносінам Польшчы і Расіі да Беларусі, змяшчае ацэнку Рыжскага дагавору, напісаную з нацыянальных пазіцый: „Тут трэба адцеміць, што ў дачыненні да Беларусі бальшавіцкая Масква заўсёды дзеіла ў згодзе з Польшчай. Каб паняволіць беларускі народ, не даць нашаму селяніну належнае яму зямлі, а нашаму работніку фабрыкаў і абярнуць аднаго і другога ў вечных нявольнікаў, бальшавіцкі, маскоўскі пралетар працягнуў руку польскаму пану, запрашаючы яго да супольных крывавых нарадаў аб тым, як найлепш і найхутчэй знішчыць беларускі народ".

З ініцыятывай выдання прац Міколы Шкялёнка ў кніжнай форме выступіў слонімскі журналіст Сяргей Чыгрын, які многа робіць па вяртанні ў беларускую культуру забароненых раней творцаў (у 1999 г. выдаў кнігу „Вяртанне да сваіх" з творамі Станіслава Грынкевіча, Франука Грышкевіча і Уладыслава Казлоўшчыка, шмат публікуе ў перыядычных выданнях). У падборцы прац Шкялёнка, якія друкаваліся ў 1930-1940-х гадах галоўным чынам у „Калосьсі" і „Раніцы", памагалі яму Аляксандра Гесь з Мінска і Міхась Казлоўскі з Маладзечна. Выданне кніжкі ажыццявіў Вячаслаў Харужы дзякуючы грашовай дапамозе Мацвея Рэпкаў-Смаршчка са Злучаных Штатаў.

Віталь Луба

*Мікола Шкялёнак, *Беларусь і суседзі. Гістарычныя нарысы*, Беларускае гістарычнае таварыства, Беласток 2003, сс. 300.

Кругі ў сусвеце

Барыс Руско, варшаўскі белавежац, інжынер вайсковай справы, дэбютаваў як паэт у 1992 годзе. Піша вершы ад больш чым дваццаці гадоў, але зборнікі пачалі друкавацца толькі ад 1998 г. Затое выйшла ўжо адзінаццатая ягоная кніжка — *Zawirowania**, у варшаўскім выдавецтве з цікавай назвай „Pani Twardowska" (ага, выдаваліся яго кнігі і ў Студыі Астрапсіхалогіі, мабыць, і тая пані Твардоўская, жонка славутага чарнакніжніка, легендарна вынесенага на наш Месяц, зусім дарэчы). Барыс Руско, аўтар ужо немалады, здаецца, быццам спяшаецца з выдаваннем плёну свае натужлівае творчае працы, выказаннем сябе ў друкаваным слове. Выказаннем сябе ў родным Белавежжы (цэлы цыкл зборнікаў), у сусвеце — мікра- і макракосмасе. Вершы Руско, калі з імі знаёміцца і спрабаваць адкрыць і ўвайсці ў іхны свет, здаюцца быць адным доўгім вершам пра дарогу аўтара да акрыцця праўды. Разам з ім *блукаем па лабірынтах* жыцця, адкрываем, што *ў жыцці — адно сонца, а столькі ценяў*, ідзем слядамі лапідарных фраз:

Твар,
быццам кніга падзей,
спачыў у далонях.
Чытаю і маўчу.

„Чалавек, выхінуўшыся з прыроды, далей крочыць уласнай дарогай, паслугоўваючыся столькі ж эмоцыямі, што і інтэлектам", — заўважыў Вальдэмар Смашч, які ад пачатку спрыяльна адносіцца так да паэтызавання Руско, як і да самога аўтара ды спадарожнічае яму ад пачатку ягонага творчага шляху, кожнаму зборніку Барыса Руско даючы быццам у пасаг свой уступ дасведчанага і вядомага крытыка. У гэты раз сваю прадмову азагаловіў „Чаму так многа памірае ў чалавеку". „Завіраванні" гэта запіс кандыцыі чалавека, які ў пэўны момант усведаміў сабе глыбокую патрэбу перадумаць нанова найважнейшыя справы. Ідзе ён *самотна, удвое, у грамадзе*, і кожны раз зусім іначай бачыць рэальнасць, якая яго акружае. Калі ты не адзін, знойдзешся *ў ядвабнай кашулі, на верасовых палях надзеі*. Часам аўтар, ходзячы па гэтых сцежках, аб'яўляе відавочнасці, а, бывае, што лірычны абразок канчае вобраз, які аркэслівае ўвесь збор вершаў: *Алеямі шпацыруе час, замятаючы сляды чалавечых крокаў*. А ў чалавека часу няшмат, пра што ўсведамляе, бывае, што запозна, нахапаўшыся жыцця ў жмені, здавалася б, са збыткам, бо было яго многа! Аўтар прымушае цябе да рэфлексіі над гэтай праўдай:

Кажаш, што маеш новую ідэю
на новае жыццё,
мусіш толькі зрабіць крок,
адцяць пупавіну, якая трымае цябе
на прывязі.
Гэта так, быццам ты скочыў у бездань
акіяна
з бутлем, у якім кісларoду хопіць
на глыток дарогі.

А калі час на гэта? Глянь: *бель прыпарушыла дрэва і тваю галаву — якія розныя полюсы.*

Барыс Руско, хоць асыпаны іскрыстай беллю, *усё падарожнічае*. Ёсць у ім неспакой і ахвота рушыць у дарогу. ***Чакае Чагосьці***. *А ўсюды рэкі заплыткія, а птушкі быццам пагубілі крылы.* А калі чалавек можа *ўзляцець над птахамі*? У *сне — у сне каханне як на далоні без канвенансаў.*

Шчасце,
Выйграўшы столькі,
усё
прадае за бясцэнак...

А ўсё жыццё? — *нагае, калі недаткнёнае розумам.*

І мудрае маўчанне.

Міра Лукша

* Borys Russko, *Zawirowania*, Warszawa 2003, ss. 108.

Аўтабіяграфія

Дамінік Аніська

Нарадзіўся я 12 студзеня 1888 г. у вёсцы Слойнікі, Сакольскага павета, Гродзенскай губерні. Мой тата, Ян Аніська і мама Людвіка з дому Галей, мелі гаспадарку. На той гаспадарцы жыў і працаваў разам з жонкай і дзецьмі малодшы брат майго бацькі, а мой дзядзька Дамінік. Зямлі ў нас было ўчастак, у якім змяшчалася 16 дзесяцін, гэтак у нашай вёсцы, а ў другіх вёсках колькасць дзесяцін на ўчастак (валоку) была іншая: дзе лепшая зямля — менш, а дзе горшая — больш.

Жонка майго дзядзькі была малодшай сястрой маёй мамы. Такім парадкам жылі разам са сваімі дзецьмі два браты і дзве сястры.

Крыху памятаю яшчэ свайго дзеда, Мацея, які памёр маючы прыблізна 75 годоў. Бабка Разалія памерла крыху пазней.

Быў у мяне старэйшы брат Яська, які вучыў мяне пачаткова чытаць і пісаць. Памёр ён маладым, пражыўшы толькі 27 гадоў. Была таксама адна сястра Рузя, старэйшая за мяне. У час першай сусветнай вайны яна аддзялілася ад дзядзькі, беручы палову гаспадаркі. Таткі і мамы ўжо не было ў жывых. Мяне таксама не было дома, быў пакліканы на вайну. Пазней сястра прыняла да сябе чалавека. У іх было некалькі дзяцей, але жывуць толькі Маня і Нюта. Яны для мяне цяпер найбліжэйшая радня. Абедзве выйшлі ўжо замуж. Сястра памерла маючы 45 гадоў. У такім, прыблізна, веку памерла і мама, а татка памёр на 52 годзе жыцця.

Цяпер аглянемся назад. Падвучыўшыся крыху ў хаце чытаць-пісаць-лічыць, я пайшоў у школу, якая была ў другой вёсцы — у Яноўшчыне, 3 кіламетры ад нас. Гэта было ў расійскія часы і школа была расійская. Дзейнічала яна толькі зімою і я праз дзве зімы, разам з іншымі дзецьмі, хадзіў туды штодня, апрача нядзель. Часам, калі была непагадзь, дык бацькі дзяцей, якія разам вучыліся, падвозілі нас у школу.

Мама, хаця крыху недамагала, але штодня варыла снеданне, а на абед я браў з сабою штосьці сухое.

Закончыўшы гэтую школу і крыху яшчэ падвучыўшыся прыватна, быў я прыняты ў Гарадскую школу ў Саколцы. Тут ужо трэба было наняць кватэру, паколькі Саколка ад нас крыху далей чымсьці Яноўшчына. У гэтай школе толькі я адзін з нашай вёскі вучыўся. Іншыя гаспадары лічылі, што гэта дорага, каб аддаць дзіця на навуку ў горад. Мае хатнія маглі сабе на гэта дазволіць, дзякуючы таму, што ў нас і гаспадарка была адна з лепшых і да гэта яшчэ быў у нас млын.

Вучыцца мне было спачатку цяжка, але з часам пайшло штораз лепш і закончыў тую школу з пахвальным лістом. Тут таксама ўсе прадметы ўключна з рэлігіяй, выкладаліся на рускай мове, адно да каталікоў прыходзіў ксёндз, а да праваслаўных бацюшка.

Закончыў я Гарадскую школу ў 1906 годзе. Яшчэ раней пачаў я даходзіць да беларускай нацыянальнай свядомасці, паколькі тут у нас яе яшчэ не было. Каталікоў называлі „польскімі", а праваслаўных „рускімі". Але ў школе гэтая тэрміналогія ўжо не была дастатковая. Нават з геаграфіі бачылася, што на свеце жывуць усялякія народы. Да якога ж тады я прыналежу? Да польскага хіба што не! Наша мова — зусім іншая!

Аднойчы, як быў я ў Горадні і, праходзячы па Саборнай вуліцы, убачыў у акне польскай кнігарні „Беларускую Дудку". Зразумела, што адразу яе купіў. Была гэта мая першая кніжка — беларуская! Прадмова да гэтай кніжкі вельмі мяне ўзрушыла і ўмацавала ў перакананні, што я беларус.

У гэты час, калі я вучыўся ў Гарадской школе, памерла мая мама і нас трох мужчын мусіла абмыць, абшыць сястра Рузя. Трэба падкрэсліць нязвыклую працавітасць вясковай дзяўчыны. Яна, як толькі стане на ногі, памагае ў гаспадарцы, няньчыць малых, вучыцца і пасе. А як ужо здужае, дык тчэ, шые, мые бялізну, не толькі для хатніх, але яшчэ стараецца прызапасіць, накласці скрыню палатна на час выхаду замуж. І ўсё толькі прыхватамі, бо штодня трэба некалькі разоў карміць усю сям'ю і скаціну, а вясною, летам і ўвосень да таго яшчэ й работа ў полі!

Цяпер, пры лепшай тэхніцы, многа што робіцца машынамі. А ў калгасах — ужо іншыя парадкі.

Закончыўшы Гарадскую школу, я не ведаў, што далей рабіць. Летам памагаў у гаспадарцы, а зімою вучыў прыватна ў Саколцы дзяцей. Чытаючы апавяданні аб войнах, асабліва пад уплывам трылогіі Сянкевіча, захацелася мне стацца вайсковым. Падвучыўшыся яшчэ крыху і здаўшы экзамен на вольнаапіснога пры Суворaўскім кадэцкім корпусе ў Варшаве, я восенню 1907 года пайшоў на вайсковую службу ў 102 пяхотны Вяцкі полк, які кватараваў у Горадні.

Тым часам, разважаў я сабе, адбуду службу, а пасля пабачу, што рабіць.

Выйшаў з войска ў 1909 г. Хацеў знайсці нейкую добрую працу, але не траплялася. Тата казаў, каб аставаўся



ў хаце, але мне хацелася недзе ў свет... І аднойчы выбраўся аж у Вільню і там атрымаў працу ў гатэлі. Калі-некалі заходзіў у рэдакцыю „Нашай нівы" па вуліцы Завальнай і там браў газету.

Так прабыў я нейкі час у Вільні. Вярнуўся ў Слойнікі і далей памагаў у гаспадарцы. „Наша ніва" даходзіла да мяне і тут. Потым каталіцкі тыднёвік „Беларус", у які я пачаў сёе-тое пісаць.

І так надыла першая сусветная вайна, якая і мяне пацягнула ў свет. Пачаткова прабываў я ў запасных батальёнах у Расіі, а потым з маршаваю ротай быў пасланы на фронт. Тады ўжо немец пасунуўся на ўсход і фронт праходзіў праз беларускія землі. Было гэта ўжо ў канцы 1915 г. Полк, да якога нас прылучылі, знаходзіўся на Беларусі. У наступным годзе выслалі мяне ў школу падпрапаршчыкаў у Кіеў. Калі закончыў школу, паслалі мяне ў запасны батальён у Расію, а тады на фронт ізноў на тэрыторыі Беларусі, у ваколіцы азёр Нарач, Мядзёл.

На фронце захапіла мяне рэвалюцыя і я як старэйшы гадамі, быў звольнены і паехаў у Мінск, які ў хуткім часе занялі немцы. Калі фронт перасунуўся яшчэ далей на ўсход, можна было ехаць дамоў. Немцы не перашкодзілі, толькі па дарозе затрымалі на кварантанну, якая працягвалася добрых пару тыдняў. Я кварантанну адбываў у Вялейцы.

Вярнуўшыся дахаты, я знайшоў сястру ўжо аддзеленую ад дзядзькі. Дома, аднак, доўга гасціць мне не прыйшлося. Быў я пакліканы ў польскае войска, бо нашы землі тады ўжо належалі да Польшчы. Было гэта ў 1920 годзе.

Спачатку быў я пасланы на афіцэрскія курсы ў Школу падхаронжых у Быдгашч, а потым на фронт каля Львова. Хутка, аднак, настала замірэнне і наш полк затрымаўся ў тых месцах на кватэрах. Пасля паслалі мяне на службу ў сапэрныя баоны, пазней у баоны цэльныя ў ваколіцах Аўгустава. У 1923 годзе быў я звольнены з войска ў рэзерв.

Пасля мне ўдалося знайсці працу ва Урадавым банку на цэлых пару гадоў, а пасля звольнілі дзеля рэдукцыі служачых, а можа і з прычыны маёй беларускасці.

Больш адпаведнае працы я знайсці не мог, дык прыйшлося сядзець у вёсцы і памагаць на гаспадарцы.

А можа гэта было і лепш, бо чалавек мог пазнаваць свой народ, які пераважна ёсць народам сялянскім.

Неяк у гэтым часе пачала выходзіць у Вільні „Хрысціянская думка" і я пачаў пісаць артыкулы і пасылаць іх туды. Пару даўжэйшых рэчаў друкавалася ў некалькіх нумарах, а потым былі яны выдадзены брашуркамі, як „Усё ў міласьці", „Да Беларускага Народу", але пераважна былі гэта рэчы дробныя. Быў гэта час нацыянальнага адраджэння і ў сваіх артыкулах я стараўся класці націск на тое, каб нашаму адраджэнню надаць хрысціянскі кірунак.

І так час пралятаў — аж распачалася другая сусветная вайна.

Як афіцэр рэзерву, быў я пакліканы ў польскае войска і пасланы ў адзін з запасных асяродкаў, што кватараваў у Вільні. Але нядоўга прыйшлося мне тут затрымацца; з аднаго боку націскалі немцы, асабліва паветранымі налётамі, а з другога — выступілі бальшавікі і іхнія вайсковыя сілы падыходзілі пад Вільню. Тады наш асяродак аднойчы вечарам выступіў з Вільні і накіраваўся да літоўскай граніцы. Мы былі вымушаны аддаць ружжо і нас літоўцы інтэрнавалі.

Пачаткова закватаравалі нас у адным маёнтку, а пасля перавезлі ў мястэчка Кальварыю, у абоз інтэрнаваных афіцэраў. Тут мы аставаліся да часу, пакуль бальшавікі не занялі Літвы. Калі прыйшлі яны сюды, дык забралі нас ды вывезлі ў Казельск. Потым, як немцы ў 1941 годзе пайшлі на Расію, дык перавезлі нас далей на поўнач у Гразовец Валагодскай губерні.

У Гразоўцу нас захапіў польска-савецкі дагавор, дзякуючы якому мы былі звольнены. Але перад гэтым да нас прыехаў генерал Андэрс, які пачынаў арганізаваць там польскае войска. І тут публічна на пляцы ў прысутнасці савецкіх афіцэраў адбылася Святая імша, якой мы ўжо даўно не мелі.

Святары, капеланы польскага войска, цэлы час былі з намі разам. І пакуль былі мы ў Літве, яны нармальна выконвалі свае святарскія абавязкі. Пры абозах былі капліцы і мы без перашкод маглі выконваць свае рэлігійныя практыкі. Але ў Саветах трэба было гэта рабіць як у катакомбах.

Усе звольненыя масава ехалі запісвацца ў польскае войска, якое арганізавалася ў Бузулуку. Разам з іншымі па-

[працяг ☞ 10]

Родам з Беласточчыны

Малавядомае імя

Са старэйшых жыхароў-беларусаў Беласточчыны можа хто і прыгадае імя Дамініка Аніські (1888-1971). У апошнім некралогу, які быў змешчаны ў беларускім лонданскім часопісе „Божым шляхам" (1971, № 5) напісана, што „Дамінік Аніська шчасліва прайшоў дзве Сусветныя войны, хаця быў афіцэрам у расійскай, а пасля ў польскай арміі. Спакойны, чэсны чалавек, беларускі патрыёт і пісьменнік, верны хрысціянін і дастойны грамадзянін, спагадлівы, працавіты і ахвярны".

Сапраўды, такім і быў Дамінік Аніська, які нарадзіўся на Сакольшчыне, а з 1949 года жыў у Лондане ў Беларускім доме, дзе і памёр.

Дамінік Аніська пражыў доўгае жыццё, але заўсёды заставаўся шчырым патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. Нават у вайсковай кніжцы (стану службы афіцэрскай) ён неяк запісаў: „Мова беларуская і народнасць беларуская, рэлігія рымска-каталіцкая".

Жывучы на эміграцыі, спадар Аніська высылаў на Радзіму пачкі з лякарствамі сваякам і сябрам, заўсёды адгукваўся на любую просьбу і дапамагаў людзям, як мог. Язэп Германовіч успамінае, што „ўсе мы добра помнім дзядзьку Дамініка: невялікага росту, сінія дабрадушныя вочы, лагодная ўсмешка, далікатнасць і ветлівасць у голасе, скромная вопратка, шчырая без ніякае позы пабожнасць" („Божым шляхам", 1972, № 1, с. 4).

У вольны ад спраў час Дамінік Аніська пісаў артыкулы на польскай і беларускай мовах. Чаму на польскай, ды таму, што была магчымасць больш друкавацца. На польскай мове ён выдаў некалькі рэлігійных брашурак, а на беларускай мове выступаў на старонках таго ж часопіса „Божым шляхам". Гэтыя артыкулы былі самыя розныя, ды і назвы іх гавораць самі за сябе. У артыкуле „Чаму трэба шанаваць рэлігію?" Дамінік Аніська па-простаму разважае, што „без веры ў Бога, без рэлігіі чалавек не мае на што абапёрціся, каб дайсці да раўнавагі: не знаходзіць ні пэўнай дарогі, ні пацехі ў сэрцы, каб выйсці з няшчасця, ці пагадзіцца з ім, пакараючыся Божай волі". У другім матэрыяле „3-яй вайны не павінна быць..." аўтар шчыра філасофствуе: „Што адносіцца да сканчэння свету, то і так кожная хвіліна часу для многіх ужо ёсць канцом свету, асабліва гэта тычыцца старых, але гэта канец толькі дачаснага свету, бо ёсць жыццё загробнае"...

Але самым каштоўным творам, які пакінуў сваім нашчадкам Дамінік Аніська, з'яўляецца яго аўтабіяграфія. Упершыню яна была апублікавана ў першым нумары часопіса „Божым шляхам" за 1972 год. У ёй найбольш дакладна і праўдзіва падаюцца звесткі пра жыццё і дзейнасць малавядомага дасюль нашага земляка. Прапаную гэтую аўтабіяграфію чытачам „Нівы".

Сяргей Чыгрын

Вольга і Аляксандр Кірылюкі

Ваенныя і неваенныя падзеі

Аляксандр Кірылюк нарадзіўся 1 мая 1925 года ў Дубічах-Царкоўных у беднай сям'і. Тутэйшыя бацькі яго, Емяльян і Таццяна, мелі чацвёра дзяцей: Мікалая, Вольгу, Ульяну і Аляксандра — наймалодшага. Бацька Емяльян быў раней у бежанстве, у Маскве, і калі выбухла Кастрычніцкая рэвалюцыя ён быў вялікім прыхільнікам новага парадку. Калі бальшавікі перанеслі сталіцу ў Маскву і ўрад размясціўся ў Крамлі, Емяльян заўсёды хадзіў на розныя мітынгі і слухаў палымяныя прамовы Леніна і Троцкага; нават асабіста гутарыў з Леніным, запісаўся ў партыю і атрымаў членскі білет — дзве чырвоныя вокладкі. І калі восенню 1939 года саветы захапілі ў нас уладу, тады Емяльян паказаў аднаму палітруку той дакумент.

— Ведь ты великий и заслуженный человек у нас, — сказаў палітрук. — Таких я ещё не встречал с таким документом.

На жаль, той дакумент згарэў у вайну ў пажары, калі згарэла амаль уся вёска.

Аляксандр, калі падрос, вучыўся ў дубіцкай школе, дзе закончыў чатыры класы. Жыццё было цяжкое, але неяк усё ішло сваім парадкам. У 1939 годзе мелі прыйсці да нас саветы і мясцовыя камуністы нарыхтавалі ім прывітальную браму з палымяным лозунгам і партрэтам Сталіна. Але неяк так дзіўна атрымалася, што заміж саветаў у Дубічы ўкрочыла механізаваная нямецкая ваенная часць. І яшчэ больш дзіўна, што нямецкія чыны з танкетак, танкаў і матацыклаў аддавалі перад брамай з партрэтам Сталіна ваенную чэсць. Гэтая часць начавала ў Дубічах-Царкоўных і ўначы вартаўнікі стралялі ўгару ракеты і адна з іх упала на Турках (частка Дубіч ад Тафілаўцаў) на страху хлява, успыхнуў пажар, а паколькі ўсё было пад саломай, згарэла палова вёскі. Людзі пасля шапталі, што гэта быў „падарунак" Дубічам за тую прывітальную браму. А як было ў сапраўднасці, адзін Бог ведае.

Калі настала нямецкая акупацыя, 10 верасня 1941 года Аляксандра і яшчэ пятнаццаць маладых людзей з Дубіч-Царкоўных прызвалі на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Васілёк, мясцовы падсолтыс, узяў на сваю фуру шасцярых „навабранцаў" (апошнія дзесяць паехалі на іншай фуры) і павёз іх у Бельск-Падляшскі. Адтуль, таксама фурамі, бо чыгунка была яшчэ парваная, але ўжо іншымі, завезлі іх у Беласток. Там на працягу чатырох дзён немцы сваіх дармовых работнікаў дэзінфіцыравалі, абстрыглі, абмылі, зрабілі медыцынскі агляд. Пасля пагрузілі на поезд і за суткі завезлі іх у горад Нойдэнбург (сёння Нідзіца) ва Усходняй Прусіі. З поезда завялі іх у арбайтсамт, а адтуль маладых работнікаў разбіралі багатыя гаспадары. Аляксандр разам з іншымі сарака работнікамі трапіў у вялікі маёнтак Скотава. Прозвішча ўладальніка маёнтка Аляксандр не помніць, бо ён быў на ўсходнім фронце, і маёнткам загадвала яго жонка. Шэсць тыдняў, да маразоў, капалі там бульбу. Кармілі слаба, бо толькі бульбай і бручкай ды давалі па кавалку хлеба. Працавалі там розныя людзі: французы, рускія палонныя, палякі і нават бедныя немцы; французаў, аднак, кармілі лепш. Калі там закончылі капанне бульбы, тады ўсіх работнікаў зноў пагналі ў арбайтсамт, адкуль бралі іх іншыя навакольныя гаспадары да яшчэ нявыкапанай сваёй бульбы. Аляксандр трапіў у маёнтак Гутлёмна, дзе праз два тыдні, да самых маразоў, закончылі работу. Там таксама было многа работнікаў, аднак кармілі лепш, бо нават траплялася зацірка. Калі закончылася і гэтая работа, тады работнікаў зноў пагналі ў арбайтсамт, адкуль іх па адным-дваіх разбіралі іншыя немцы.

Аляксандра забраў Отта Юрашкевіч з мясцовасці Гардэнхаузен, які меў вялікую гаспадарку — 360 моргаў зямлі. Гаспадар быў мазуром і ўся ягоная сям'я гаварыла па-польску. Гаспадар быў запальчывым чалавекам, але людзей сваіх не крыўдзіў і добра карміў; Аляксандр добра яго ўспамінае. Аляксандр пазнаёміўся там з Вольгай Грыгарук, маладой прыгожай дзяўчынай з Галадоў, што каля Бельска, якая таксама трапіла на прымусовыя работы; яны спадабаліся сабе і пасля вайны і вяртання дадому пажаніліся. Работы ў гаспадара хапала, як кажуць, па самыя вушы. Цяжка было спаткаць маладога немца, бо ўсе, ад 18 да 54 гадоў, былі на фронце. Работнікі жылі і начавалі ў доме гаспадара і важнае было тое, што сам гаспадар і яго жонка Марта былі парадачнымі людзьмі.

Калі сталі падступаць саветы, восенню 1944 года гаспадар выслаў сваіх работнікаў капаць акопы ў ваколіцах Граева, а пасля Мікалайкаў. З акопаў Аляксандр вярнуўся зноў да Отта Юрашкевіча, але гаспадара неўзабаве забралі на фронт і далейшы яго лёс невядомы. Зімою, у канцы 1944 года немцы сталі ўцякаць на захад. Таксама гаспадыня Марта з дзецьмі і ўсе іх наёмнікі падаліся на захад. Аляксандр разам з палякам Уладкам селі на трактар з прычэпам, на які пагрузіліся гаспадыня Марта з дзецьмі, Вольга і іншыя работнікі. Паехалі на паўночны захад, забіраючы вялікі статак кароў і іншае багацце; быдла скора разбеглася па полі. Трактар быў на бензін і некалькі разоў прыходзілася запраўляцца, але войска, якое было навокал, не шкадавала паліва. Ехалі так чатыры дні і ў вёсцы Гаміндорф разлучыліся са сваёй гаспадыняй у час вялікай перастрэлкі між немцамі і рускімі; далейшы лёс Марты і яе дзяцей таксама Аляксандру невядомы.

Скора насталі саветы, якія спачатку добра адносіліся да палонных. Пасля натоўп уцекачоў з Нямеччыны спынілі і адзін генерал дапытваў, хто яны. Калі хто гаварыў, што ён паляк, тады генерал нічога не гаварыў, толькі паказваў рукой адысці набок. Але калі пачуў, што ўцякач беларус, тады наступала грубая лаянка генерала, што здраднік радзімы і сволач, якую толькі расстраляць, а за ёю цяжкі ўдар па твары. Нашага Аляксандра, хаця прызнаўся беларусам, гэтая „прыемнасць" мінавала, мо таму што назваў генарала „господином генералом". Аляксандру яшчэ пашанцавала і ў тым, што не трапіў у перадавую. Пасля шматлікіх захадаў і прыгод пасля Каляд 1945 года вярнуўся ён у родныя Дубічы-Царкоўныя. Уся сям'я была ў цэласці, але жыла ў зямлянцы. Сёстры Ульяна і Вольга яшчэ да вайны павыходзілі замуж: адна ў Тафілаўцы, а другая ў Ягаднікі; брат Мікалай таксама ажаніўся.

Варта прыгадаць, што сям'я гэтая з вельмі дужых людзей. Бо і Аляксандр і ягоны брат Мікалай славіліся найдужэйшымі не толькі ў сваёй вёсцы, але і ў цэлым наваколлі. І бацька іх, Емяльян, таксама меў цяжкую руку. Яшчэ да вайны быў ён лоўчым і аднаго разу злавіў у дубіцкім лесе браканьера з Карыцкаў, які акурат стаўляў капканы на звярыну. Емяльян здорава яго аддубасіў, забраў стрэльбу, хаця ў суд не падаў.

Восенню, на Міхайла 1945 года, Аляксандр згуляў вяселле са згаданай раней Вольгай Грыгарук. Вянчаліся ў царкве ў Вэрстоку, бо дубіцкі бацюшка „заспяваў" за вянец аж шэсць метраў збожжа, а вэрстоцкі (нейкі васточнік) за гэтую паслугу ўзяў толькі адзін пуд. Праз год, восенню 1946 года, Аляксандра прызвалі ў польскую армію; трапіў ён у артылерыйскі полк у Жары, што ў Ніжняй Сілезіі. Калі Аляксандр праслужыў там сем месяцаў, яго часць наведаў міністр абароны Міхал Роля-Жымерскі і ў час інспекцыі маршал спытаў, ці хто з салдат мае можа да яго якую просьбу. Усе стаялі на зважай, баяліся. А тут Аляксандр Кірылюк выступае наперад, салютуе і кажа:

— Грамадзянін маршал, у мяне дома цяжкія абставіны: бацькі старыя і маладая жонка жывуць у зямлянцы, няма каму гаспадарыць. Калі можна, прашу звольніць мяне з войска.

Маршал Жымерскі сказаў Аляксандру вярнуцца на сваё месца. Праз два тыдні нашага героя звольнілі з войска ў запас і ён вярнуўся дадому.

Мікалай Панфілюк

Аўтабіяграфія

[9 ☞ працяг]

ехаў і я. Была нястача памяшканняў. Частка войска стаяла ў палатках нават і зімою. Падвойныя палаткі, наўкола абмерзлыя, але людзі нейк давалі сабе раду, каб не замерзнуць.

Партыя старэйшых людзей высылалася на поўдзень, у Казахстан, дзе ўсё ж такі цяплей было. Туды трапіў і я. Ехалі цягнікам каля двух тыдняў, харчаваліся пераважна сухою ежай, а калі часам удалося зварыць на печцы „кіпятку", дык і без гарбаты і без цукру было смачна.

Прыехалі мы ў горад Каган і закватаравалі нас на адным пляцы, дзе было ўжо многа звольненых польскіх уцекачоў, мужчын і жанчын. Усё гэта было пад адкрытым небам, людзі днявалі і начавалі на сваіх рэчах. Праўда, тут было яшчэ цёпла і не ішоў дождж.

Але становішча наша тут было няпэўнае, што рабіць далей? Сабраўшыся, пастанавілі рабіць стараннi, каб вярнуцца назад у Бузулук. Улада, хоць вельмі неахвотна, згадзілася на нашу прапанову і мы вярнуліся. Тут, хаця былі страшэнныя маразы, але мелі нейкі куток і жаўнерскую рацыю.

Потым з войскам генерала Андэрса я выехаў з межаў Расіі — спачатку ў Персію, а пасля ў Палесціну. Сталася гэта ў 1942 г. Прабыў тут каля чатырох год. Спачатку ў абозах, а потым увесь час у Іерусаліме.

Калі ехалі мы ў Палесціну (цяпер Ізраіль), я цешыўся, што змагу наведаць Святыя месцы.

Тут ужо было матэрыяльнае забеспячэнне. Не толькі мы, якія лічыліся яшчэ пры войску, але і кожны з уцекачоў атрымліваў успамогу ад сацыяльнай апекі.

Будучы ў Іерусаліме я апісаў Святыя месцы, а пасля калі ў Англіі, дык друкаваліся яны ў некалькіх нумарах часопіса „Божым Шляхам". Напісаў я яшчэ брашуру „Як жыць?", якая была там надрукавана на польскай мове. У Іерусаліме я памагаў тэхнічна ў выдаванні польскага каталіцкага тыднёвіка „Tygodnik Katolicki", у якім і маіх пару дробных артыкулаў было змешчана.

Потым год прыйшлося прабыць у Егіпце, а адтуль у 1947 г. перавезлі нас у Англію. Спачатку быў я ў абозах, а ад 1949 г. у Лондане. Тут напісаў і была выдадзена на польскай мове брашура „Pod berło Chrystusa Króla". Была выдадзена яшчэ мая брашура „Wszystko świadczy o Nim", аб існаванні Бога.

Калі ідзе пра работу, дык спачатку не вельмі я спяшаўся, бо і англійскую мову ведаў слаба і ў пажылыя гады цяжэй ужо штосьці падыходнае знайсці, але пакрысе сюд-тут працую яшчэ і цяпер, не так дзеля заработку, як для разрыўкі, бо зарабляць мала ў чым дам рады.

Ад пачатку прыезду ў Лондан жыву ў Беларускім доме, памагаючы ў дагляданні яго, а таксам па меры магчымасці крыху памагаю сваім блізкім на Радзіме.

Сюды-туды здарыцца яшчэ напісаць і надрукаваць у газеце якісьці артыкул на беларускай ці польскай мове. Маю яшчэ крыху ненадрукаваных матэрыялаў, з якіх яшчэ можа калі што і надрукуецца.

Дамінік Аніська

Сапраўдны кавалак раю

19 ліпеня г.г. у агратурыстычнай гаспадарцы „Купала” Ірыны і Зіновія Галёнкаў у Арэшкаве-Парыеве адбылося рэгіянальнае мерапрыемства „Купалінка” з галоўным пунктам праграмы — IV Агратурыстычным чэмпіянатам свету па кіданні кавальскіх абцугоў. Сабралася шмат народу — некалькі соцень чалавек і ніхто не павінен быў шкадаваць. Можна было павудзіць, пакатацца на конях або на вадзяным веласіпедзе, палюбавацца страусамі, добра з’есці, выпіць і патанцаваць ды, вядома, пакідаць абцугамі, за што шчодрыя гаспадары традыцыйна ўзнагароджвалі найлепшых.

Гаспадарка „Купала”, якая знаходзіцца на краю жывапіснай Белавежскай пушчы, нягледзячы на розныя цяжкасці, інтэнсіўна развіваецца і сёння з’яўляецца казачным месцам адпачынку на ўлоні прыроды. Для гараджан гэта сапраўдны кавалак раю.

Праграма мерапрыемства, як заўсёды, была вельмі цікавая і багатая. Спадар Зіновій Галёнка ўкладвае ў яе арганізацыю шмат свайго сэрца (не гаворачы пра грашовыя сродкі) з думкай аб усёй публіцы: маладзенькіх і пажылых, пастаянных удзельніках — каб падзея была цікавейшая і багацейшая. Хаця сустракаюцца там розныя людзі, пануе там сямейная атмасфера.

Да поўдня адбываліся сямейныя спаборніцтвы вудзільшчыкаў у лоўлі „залатой рыбкі”. Наймалодшаму вудзільшчыку — Данелю Рабчуку — было шэсць гадоў, а найстарэйшаму — Зіновію Галёнку (сеніёру) — восемдзесят. Усяго злавілі за дзесяць кілаграмаў рыб; некаторыя нават па больш чым сто штук. Усе прыгодныя па велічыні рыбы вудзільшчыкі забралі дамоў. Пераможцы атрымалі кубкі ў выглядзе рыб, а апошнія спаборнікі — дыпломы. Галоўны трафей, „залатую рыбку”, заваяваў Пётр Шпаковіч. Усе вудзільшчыкі сфатаграфаваліся таксама для памятнага здымка.

Пасля поўдня на пашы для тарпанаў адбыўся IV Агратурыстычны чэмпіянат свету па кіданні абцугоў, які выклікаў вялікае зацікаўленне публікі. Кожны з трох катэгорый удзельнікаў — мужчын, жанчын і моладзі — тройчы кідаў кавальскія абцугі рознай велічыні. Сярод мужчын перамог Ян Вакулюк, які кінуў на адлегласць 35,80 метра і атрымаў за гэта чорнага барана. Сярод жанчын перамагла Тэрэса Мусько — 19 метраў — і за тую перамогу атрымала белага казёлчыка па клічцы „Матолак”. Сярод маладых перамог Войцех Кучка, абцугі якога праляцелі 25,50 метраў.

У час „Купалінкі” на нуду ніхто не наракаў. Можна было прыглянуцца паводзінам звяроў і птушак, пакупацца, або пракатацца на вадзяным веласіпедзе. Іншыя пеклі каўбаскі пры вогнішчы або вэндзілі кумпякі і рыбу. Быў гарачы бігас, а хто хацеў і мог насалоджваўся экалагічным развесяляючым напоем. Танцавалі басанож на зялёнай мураве пад гукі бадзёрай жывой музыкі; моладзь танцавала басанож у вадзе. Найстарэйшаму танцору было 83 гады, танцаваў ён з намнога малодшымі вельмі задаволенымі ім людзьмі.

Некамерцыйнае мерапрыемства „Купалінка”, як і папярэднія, удалося, запар з пастаянным эпізодам — дажджом. П’яных не было, а аднаму хлопцу, які з’явіўся ў падвыпіўшым відзе, так усё спадабалася, што ахоўнікі выводзілі яго чатыры разы, а ён чатыры разы вяртаўся.

Густы дождж пайшоў пасля дзевятай вечара. Музыкі аж падтапіліся, але іграліі да канца — як на „Тытаніку”. Гуляла амаль уся вёска Арэшкава, сёлета страт не было (два гады таму „выпарылася” бочка піва), а госці пакінулі пасля сябе парадак.

* * *

— Як змянілася „Купала” на працягу апошняга года? — пытаю Зіновія Галёнку.

— З’явілася павець на шэсцьдзесят асоб і шэсць вялікіх сталоў з таполі заміж ранейшых пластмасавых. Зрабілі цікавую браму для дзіцячых гульняў і... не стала грошай. Працу будзем працягваць у будучым годзе.

У заапарк прыбылі фазаны, казёл новай расы; некалькі жывёл адышло, некалькі нарадзілася. Страусы вельмі добра перанеслі зіму. Уездзілі двух тарпаноў і малапольскую кабылу.

— Ці цяпер зручны час для агратурызму, ці ёсць перспектывы?

— Такіх, каб гаспадарка сама фінансавалася, няма, абсалютна! Нягледзячы на тое, што тут міні-заапарк, зацікаўленне грамадства — памяркоўнае. Прыязджаюць людзі з Польшчы, але пакідаюць малыя грошы, а навакольнае насельніцтва амаль не пакідае ніякіх грошай.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Маладыя вудзільшчыкі з Арэшкава

— А што наконт уласнай начлежнай базы?

— Людзі звоняць, пытаюць пра выгады. Пабудова майго пансіяната спынілася, стаіць. А гэта таму, што рэстаран „Белая ружа” не дае ніякіх прыходаў, а нават наадварот — спараджае страты; блакада, якою ад трох гадоў аблажыла мяне мясцовае самакіраванне, дала свой вынік. Я, каб не акунацца ў даўгі, вымушаны закрыць у палове жніўня рэстаран.

— Ці любіце сваю гаспадарку?

— Так. Я тут аднаўляю свае сілы, зараджаюся энергіяй.

Міхал Мінцэвіч

Музейны фонд

Грамадскі камітэт пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы праводзіць збор грошай на пабудову музея. Ахвяраванні на пабудову музея (у польскай і замежнай валютах) просім пералічваць на рахунак: **PKO BP S.A. O/ Hajnówka, nr konta: 26 10201332 100120228.**

Спіс чарговых ахвяравальнікаў:

5 148. Славамір Калішук (Драгічын) ..... 20,00 зл.
5 149. Васіль Раманюк (Гайнаўка) ..... 50,00 зл.
5 150. Уладзімір Юзвюк (Беласток) ..... 24,00 зл.
5 151. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 137,00 зл.
5 152. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 10 амерыканскіх долараў
5 153. Марэк Апановіч (Гайнаўка) ..... 25,00 зл.
5 154. Канстанцін Лукашэвіч (Беласток) ..... 50,00 зл.
5 155. Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім, I „а”, I „ц”, I „е” класы ..... 100,00 зл.
5 156. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 300,00 зл.
5 157. Турыстычнае бюро „KORNELUK” (Варшава) ..... 30,00 зл.
5 158. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 89.00 зл.
5 159. Гмінная гімназія (Сямятычы) ..... 50,00 зл.
5 160. Турыстычнае бюро „BUMERANG” (Бельск-Падляшскі) ..... 30,00 зл.
5 161. Міхал Голуб (Гайнаўка) ..... 30,00 зл.
5 162. Падставовая школа н-р 10 (Холм) ..... 20,00 зл.
5 163. Міхал Дулько (Белавежа) ..... 20,00 зл.
5 164. Праваднікі ПТТК з Гайнаўкі ..... 82,00 зл.
5 165. Падставовая школа н-р 15 (Беласток) ..... 30,00 зл.
5 166. Падставовая школа (Мень) ..... 30,00 зл.
5 167. BUTiR „ALF” З. і Т. Лесняк (Аполе) ..... 30,00 зл.
5 168. Ян Карчэўскі (Гайнаўка) ..... 30,00 зл.
5 169. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 208,00 зл.

Дзякуем. Наш адрас: **Społeczny Komitet Budowy Muzeum i Ośrodka Kultury Białoruskiej, 17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42, tel. (085) 682 28 89.**

Як паляк французанку ашукаў

Польскія ўлады наладзілі маладым земляробам месячную экскурсію ў Францыю, каб перад уваходам нашай краіны ў Еўрасаюз, пабачылі яны як жывуць французскія фермеры, ды дастасоўвалі свае гаспадаркі да французскага стылю гаспадарання. На гэтую экскурсію паехаў быў Сташак з Падляшскага ваяводства, якому бацькі перадалі сваю гаспадарку ў карыстанне.

Затрымаўся Сташак у фермера, у якога была прыгожая дачка. І адразу адно аднаму спадабаліся. Сташак расказваў пра сваю гаспадарку, старых бацькоў, якія даглядаюць гаспадарку, пра лавачку і млын. Наракаў, што польскія дзяўчаты на вёску не хочуць выходзіць замуж.

Бацькі дзяўчыны заўважылі, што Сташак заляцаецца да іхняй дачкі, а што прыгожы і багаты ён, дык падумалі выдаць дачку замуж за яго. Маладыя хутка згулялі вяселле. Перад выездам у Польшчу Сташак паведаміў сваім бацькам, што ажаніўся з французанкай і неўзабаве прыедуць удваіх, каб бацькі наладзілі гасціну і запрасілі ўсіх сяброў. Прыехаўшы весяліліся і гулялі тры дні. Калі ўсё супакоілася і госці разышліся, маладая жонка папрасіла мужа, каб паказаў ёй сваю лаўку і млын. Вывеў Сташак жонку на панадворак і паказваючы пальцам на столак, які стаяў пры хаце, сказаў:

— Вось мая лаўка, дзе заўсёды адпачываю з сябрамі. Пасля ўзяў жонку за руку, павёў у сені і паказаў ёй жорны. Вось мой млын! — Я буду сыпаць збожжа, ты будзеш круціць, а адсюль пасыплецца мука.

Раззлавалася французанка на свайго мужа, кінула яго і вярнулася дадому да бацькоў.

Мікалай Лук’янюк

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота ГАЛІНЫ РАМАШКІ

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Сужонства рашыла зберагаць грошы і пасля кожнай любоўнай схваткі пакідаць у скарбонцы па сто злотых. Праз некалькі тыдняў пацікавіліся збераженнямі. Адкрылі скрынку і муж са здзіўленнем убачыў, што апрача стозалатовак ёсць там двухсотзалатоўкі і банкноты ў сто долараў.

— Даражэнькая, — пытае жонку, — як памятаю, я ўкідаў толькі соткі. Ці можаш мне растлумачыць, што здарылася?

— А ты думаў, што ўсе такія скупягі як ты!?

* * *

Пасля поўначы маладыя выходзяць з вяселля на пасляшлюбны начлег. Праводзячы іх цешча звяртаецца да зяця:

— Будзь далікатны і беражна з ёю абыходзься.

— Ведаю; не трэба мне пра гэта прыгадваць.

— Асцерагаю, бо яна цяжарная...

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— Ці цябе таксама суправаджаюць няўдачы ў любві?

— Мяне? Мой муж ніколі яшчэ мяне не заспеў!

* * *

— Мне мужчыны — як паветра!..

— Гэта відаць, што ты задаволена зменамі клімату!

* * *

На пляжы жонка дакарае мужа:

— Калі толькі ўбачыш нейкую прыгожую дзеўку, адразу забываеш, што ты жанаты!

— Зусім наадварот — адразу ўспамінаю пра гэта.

* * *

Сустракаюцца два буслы:

— Куды нясеш гэтае дзіця?

— Трэба мне даставіць яго ў вёску, але хіба занясу ў горад, бо з вёскі яно пасля і так уцячэ.

* * *

Пакупнік з прэтэнзіяй да прадаўца:

— Вы прадалі мне ўчора фігурку, кажучы, што яна са слановай косці, а адзін эксперт сказаў мне, што яна з пластмасы!

— Гэта немагчыма! Адкуль у слана пластмасавыя біўні?

* * *

Паховіны, муж галосіць над магілаю жонкі.

— Сыне, — пацяшае святар, — не трэба так рыдаць...

— Ды я не над сабою літуюся, толькі пра Бога гарую.

— Як гэта?

— Бо, бачыце, я з гэтай ведзьмай сорак гадоў мучыўся, а Бог узяў яе на ўсю вечнасць...

Адгаданка

Двулікі свет

Анаграмная шарада

У *хаце галерэю маю* ***Я****,*
ДЫ *не* ***НА*** *сценах* ***У*** *мяне карціны.*
Мая калекцыя — тэлевізі-я,
Там я гляджу нізы і верхавіны.
Высока віскі ***П'ЮЦЬ*** *і* ***НА*** *біржы* ***ГРАЮЦЬ***
І *як воран ворану там другу* ***ДРУГ****.*
Нізавы люд такіх турбот не знае;
Яго азарт — канец звесці к канцу.

(Ш)

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне — прыказку — з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **А-4, П-7, Д-6, Г-7.**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 25 нумара

Дзюдо, Ева, жорны, Конеў, мера, цана.

Рашэнне: **Не вер каню ў дарозе, а жонцы дома.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Бабка добра зробленая

Чаго як чаго, аднаго я ў жыцці шкадую. Што няма ў мяне родных унукаў. Але я ўжо дзед, і шмат малечаў ды большанькіх мяне гэтак называе. Для іх усе старэйшыя за бацькоў, калі тыя вельмі маладыя, — бабы і дзяды, ці ім сорак, ці пяцьдзесят, ці восемдзест. Мой „унучак” Радзівон адно толькі зазначае: для яго Агата гэта бабуля, а ягоная прабабка Верка, старэйшая ад Агаты на восем гадоў, гэта „бабуля-старушка”. Раз нават сказаў, што „бабуля-старушка” — „брыдка зробленая”! Прабабка, праўда, і прыгорбленая крыху, і худая-паморшчаная, але, як той казаў, калі б яе распрасаваць, падмаляваць, прыфарбаваць, напудрыць, дык і які аматар на яе знайшоўся б. Жанчыны ж кажуць — зрабіць сябе на багіню, значыць, фэст выглядаць. Маёй Агаце хопіць, як пойдзе да цырульніка, і адразу настрой папраўляецца. І сябры мае жонкі запрасілі бабулю-старушку да сябе ў Амерыку. І візу атрымала — у пасольстве, пэўна, падумалі, што доўга ў вялікім свеце не пабудзе, не заседзіцца. Да канца пабыўкі, мабыць, і не дацягне, але ў такім выпадку гэта не праблема амерыканскага ўрада. А на тэрарыстку не змахвае баба Верка, нават пераапранутую. Хоць палачка ў яе небяспечная, сам бачыў — калі хтосьці на бабу Верку нападзе, нічога не спадзеючыся, дык з яе, калі бабуля націсне гузічак, выскоквае лязо. Ну, але пра гэта ў пасольстве ніхто не ведае і не спадзяецца, а ў тым узросце нікога не клічуць на асабістую размову з консулем.

Паляцела баба Верка за акіян. Адразу пазваніла, што і як. Агата напісала мне, што бабка робіць фурор сярод аброслых тлушчам амерыканак яе ўзросту, або, лепш сказаць, сярод дзядуляў. Нават знайшоўся адзін дзядзька, які павёў яе пад вянец. Дзед Сэм быў маладзейшы ад бабы Веркі на дзесяць гадоў. Баба Верка свайго новага мужа адкарміла, дапесціла, дагледзела, але не памаглі вялікія грошы на лекаванне нашпрыцаванага амерыканскім стылем жыцця багатага пенсіянера. Пахавала яго баба Верка, узяла грошы і захацела дахаты. Хопіць таго шчасця! Толькі спачатку таго амерыканскага жыцця трэба пакаштаваць, адчуць усім нутром, што гэта за такое. Рашыла Верка выдаць крыху грошай на сябе.

Агата прыслала мне загадкавы ліст, з якога вынікала, што Веркі ўжо няма, ёсць Вэра, і то не тая, што калісь. І што на нейкай ферме ці фарме яна. Думаю, здурэла баба — на гаспадарку і на Падляшшы магла б Вера ці то Вэра падацца, ды нашто ёй, гараджанцы, такія выдрымусы. Нават у гэтым узросце, хоць „брыдка зробленая”, знайшла б не аднаго Сэма, каб яго галубіць, і то зусім нестарога. У нас ніякая баба не змарнуецца, каб адно толькі захацела на вёску.

У Амерыцы няма старых кабет, у якіх ёсць грошы. Твар — як каленка, на пяць гадоў, цела — на шэсцьдзесят, а па руках пазнаць, што ўласніцы восемдзесят вёснаў. Толькі ўсміхацца не зможа — скура, падцягнутая і пасшываная за вушамі і дзе там яшчэ, не дае ні смяяцца, ні грымасу зрабіць. Гэтак Вера і стала перад сваім праўнукам, адноўленая. Толькі ссутуленасці не паправілі. І па голасе пазнаць яе можна. Ды акцэнт амерыканскі паявіўся, пэўна, з-за завялікіх новых зубоў.

— Глянь, Радзівон, я ўжо „добра зробленая”. Ну, я твая прабабця Вэра.

— Ды ў цябе твару няма! — Радзівон узяў падарункі і аступіўся.

Вандал Арлянскі

Цемра лясная

Перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва мядзведь Сандар Жоржавіч прачнуўся выдатна выспаўшыся. Расплюшчыў вочы, а за акном ягонай бярлогі — цёмна, а прыбярложныя салаўі расспяваліся на поўную катушку.

— Дзіўна, — падумаў старшыня. — Птаства ўстала, я ўстаў, а наўкола — цемра.

Выйшаў за бярлогу. Запытаўся ў салаўя Салафановіча:

— Што гэта такое? Дзе святло?

Салафановіч зацюрлікаў, нервова страпянуўшы крыллем:

— Цюр-не-цюр-цюрма-ма, цюр-не-цюр-ма! Ой-што-гэта-цюр-будзе? Ой-што-што-та-цюр?

Мядзведзь апусціў панура галаву — пыса зморшчылася яму ў одуме.

Тым часам кіраўніцтва старалася дабрацца на паляну. У нечаканай цемры лані Гаўрусісе путаліся ножкі. Далей кожную хвіліну чуваць было „бу-ум” — вавёрка Кацюша прабавала па дарозе на паляну пераскокваць з дрэва на дрэва і валілася на лясную глебу. Барсук Барушчук (той, што ў кіраўніцтве замяніў дзіка Свіналыча, які пасля далучыўся да кампаніі змяі Ссапіі і вужа Ззянона) тоўк пысай у заднія зблытаныя ногі Гаўрусіхі.

— Даруйце, мадам, — прамармытаў, калі ў цемры знюхаў, з кім, так сказаць, мае дачыненне.

Пры нагодзе дапамог разблытаць ланіны ножкі і разам дабраліся на сход.

Сандар Жоржавіч давалокся апошні. Гэтым разам, так сказаць, дзякуючы вядомаму толькі сабе сабачаму нюху.

— Мішка, вы наш каханы, што з намі тут парабілася! — у дуэце гукнулі на прывітанне мядзведжай велічнасці Гаўрусіха з Кацюшай.

— От, і не ведаю, — цяжка ўздыхнуў Жоржавіч. — Трэба папытацца ў дзятла Стукача. З дубовай гары бліжэй да гэтай аранжавай плямы, што нам сёння чамусьці не свеціць. Хай гаворыць дзяцел.

Стукач зляцеў на найніжэйшую галіну дуба, перакрывіў дзюбу ўверх і адказаў таямнічым і неадпаведным гукам. Прагучала гэта: „А-у-у-у”. Сандар Жоржавіч зразумеў адразу:

— Ага, гэта махінацыя ваўка Нятупіна з Уладзімірскага лесу.

Стукач пацвердзіў:

— А-у-у! Сонца адключыў нам той дзікі пёс. А-у-у!

— А, сабака пракляты! — зароў мядзведзь. — Ну, нічога. Справімся! Загадваю, каб кожны звер, птах, гад і паўзун ды млекакормячы зараз жа засвяцілі вачыма. Калі кожны салідарна засвеціць, будзе ў нас светласць, да таго наша, уласная. Хай стане светласць! Хай сабе Нятупін і не думае, хай вые сабе да месяца.

Кіраўніцтва разбрылося па лесе з навінай. Мядзведзь лёг у сваёй барлозе. Зараз потым зрабілася светла.

— Добрая звярына! Мая звярына ўмее ўсё, — уздыхнуў старшыня сходу з гонарам.

У лесе рабілася ўсё відней ды святлей. Устрывожаны Жоржавіч вылез перад бярлогу. На небе пачынала ззяць сонца. І звярына таксама свяціла вачыма. Мядзведзь жмурыўся ўсё мацней. Урэшце не стрымаў і самлеў ад празмернага бляску.

З узлеска на ўскраіне лесу неслася хіханне. Гэта Ссапія, Ззянон ды Свіналыч, радасна сплёўшыся, адсвяткоўвалі першае ад шмат гадоў сонечнае зацьменне, якое якраз канчалася над мядзведжым лесам.

МакХолад

ISSN 0546-1960